Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 213 (5899) | 22 верасня 1937 г., серада | ЦАНА 10 КАП.

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

ТАВАРЫШ К. Е. ВАРАШЫЛАЎ НА МАНЕЎРАХ БЕЛАРУСКАЙ ВАЕННАЙ АКРУГІ

РАЁН МАНЕЎРАЎ, 21 верасня. (БЕЛТА). На манёўры войск Беларускай ваеннай акругі 21 верасня прыбыў народны камісар абароны маршал Совецкага Саюза таварыш К. Е. Варашылаў.

Народнага камісара абароны ў раёне манёўраў сустрэлі камандуючы войскамі Беларускай ваеннай акругі камандарм 1-га ранга тав. Белоў і член Ваеннага совета акругі армейскі камісар 2-га ранга тав. Мезіс. Разам з народным камісарам прыбылі начальнік генеральнага штаба РСЧА камандарм 1-га ранга тав. Шапашнікаў і сакратар ЦК КП(б)Б тав. Волкаў.

Вестка аб прыбыцці народнага камісара абароны таварыша Варашылава хутка абляцела раён манёўраў. Гарады, рабочыя пасёлкі, калгасы ўпрыгожаны лозунгамі, плакатамі, сцягамі і транспарантамі. Усюды — партрэты таварыша Сталіна, кіраўнікоў партыі і ўрада. Насельніцтва горача вітае сваю родную Чырвоную Армію і жалезнага наркома К. Е. Варашылава.

Увесь дзень таварыш Варашылаў правёў у часцях, якія прымаюць удзел у манёўрах, уважліва правяраючы іх баявую работу.

ЗВАРОТ СТАХАНАЎЦАЎ ГОРАДА МЕНСКА

«Стаханаўскі рух, — гаворыць таварыш Сталін, — нельга разглядаць, як звычайны рух рабочых і работніц. Стаханаўскі рух гэта такі рух рабочых і работніц, які ўвойдзе ў гісторыю нашага соцыялістычнага будаўніцтва, як адна з самых слаўных яе старонак».

Вялікая Кастрычніцкая Соцыялістычная рэволюцыя вызваліла працу ад векавога рабства. Машына са сродку эксплаатацыі ператварылася ў крыніцу аблягчэння працы, дастатку і шчасця. Панаваўшыя эксплаататарскія класы душылі народныя таленты. Кастрычніцкая рэволюцыя вызваліла іх. Як ніколі і нідзе ў свеце, у СССР развілася народная творчасць. Праца стала справай славы, справай гонару, справай доблесці і геройства.

Стаханаўскі рух высунуў тысячы і дзесяткі тысяч новых талентаў. Стаханаўцы — сапраўдныя рэволюцыянеры вытворчасці. З асяродзя стаханаўцаў з кожным днём вылучаюцца сотні і тысячы таленавітых кіраўнікоў вытворчасці, выдатных майстроў прамысловасці, сельскай гаспадаркі, транспарту і гандлю.

Шкоднікі, прабраўшыяся на кіруючыя пасты ў прамысловасці, усяк глушылі народны стаханаўскі рух. Шпікі, шкоднікі і дыверсанты не толькі тармазілі стаханаўскі рух. Яны ставілі перад сабой задачу фізічнага знішчэння рабочых і ў асаблівасці стаханаўцаў, — палкіх патрыётаў вялікай радзімы працоўных усяго свету — СССР. Не толькі ў Кемераве шпікі і шкоднікі скрывавілі свае паганыя рукі кроўю лепшых сыноў нашай радзімы — стаханаўцаў. У Совецкай Беларусі польскія шпікі на радзе прадпрыемстваў ставілі асноўнай сваёй мэтай арганізацыю фізічнага знішчэння стаханаўцаў. Сотні так званых няшчасных выпадкаў, якія здараліся на фабрыках Беларусі, як зараз зусім відавочна, — справа рук польскіх шпікоў, трацкісцкіх і бухарынска-рыкаўскіх шкоднікаў і дыверсантаў.

Подлых злачынстваў, тварымых шпікамі і шкоднікамі супроць стаханаўскага руху і стаханаўцаў, не заўважылі многія гаспадарнікі. Бясклопатнасць, дзяўства — вось тыя прычыны, якія далі магчымасць ворагам арудаваць на прадпрыемствах беспакарана. Не заўважылі ў Беларусі і таго, як шпікі, шкоднікі і дыверсанты сістэматычна падрывалі стаханаўскі рух. Стаханаўцы менскіх прадпрыемстваў расказваюць, што на радзе фабрык і заводаў ужо даўно не чуваць слова «стаханавец». У заўкомах і мясцкомах ніякага адрознення не праводзіцца паміж стаханаўцамі і нестаханаўцамі.

Пісьмо ініцыятараў стаханаўскага руху ў Беларусі, пастанова ЦК КП(б)Б з повалу гэтага пісьма ўскалыхнулі стаханаўцаў прадпрыемстваў. На фабрыках і заводах гэта пісьмо знайшло жывы водгук сярод усіх рабочых. Пярвічныя партыйныя арганізацыі, зразумеўшы сваю памылку, быстра падхапілі заклік ініцыятараў стаханаўскага руху ў Беларусі. Нельга таго-ж сказаць аб прафесіянальных арганізацыях. Нават цэнтральныя праўленні прафесіянальных саюзаў Беларусі амаль нічога яшчэ не зрабілі ў галіне арганізацыі стаханаўскага руху. Адсутнасць пралстаўнікоў прафесіянальных арганізацый на радзе стаханаўцаў г. Менска гаворыць аб многім. Партыйныя арганізацыі з гэтага факта павінны зрабіць усе вывады. Ад цэнтральных праўленняў прафесіянальных саюзаў неабходна патрабаваць неадкладнага і карэннага змянення сваіх адносін да стаханаўскага руху.

Арганізацыя стаханаўскага руху — кроўная справа гаспадарнікаў. Не глядзячы на гэта, кіраўнікі фабрык і заводаў у гэтай галіне працуюць вяла і незадавальняюча. Стаханаўцы справядліва патрабуюць ад гаспадарнікаў увагі да сябе. І яна павінна быць аказана.

У апублікаваным намі ўчора звароце стаханаўцаў г. Менска дадзена зусім ясная і канкрэтная праграма работы ў галіне арганізацыі стаханаўскага руху ў Беларусі. Стаханаўцы падверглі таварыскай крытыцы пэлы рад прадпрыемстваў і адстаючых галін гаспадаркі і патрабавалі паляпшэння работы.

«Мы, — пішуць стаханаўцы ў сваім звароце, — асобна звярачаемся да рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і кіраўнікоў абутковай фабрыкі імя Кагановіча, швейнай фабрыкі «Кастрычнік», станкабудаўнічага завода імя Варашылава, завода імя Мяснікова, імя Молатава:

Вы, таварышы, многа запазычыліся краіне. Пара вярнуць гэты доўг спаўна і дабіцца не толькі выканання, але і перавыканання промфінплана.

Мы звярачаемся таксама да будаўнікоў г. Менска і рэспублікі:

Вы недапушчальна зацягваеце сканчэнне важнейшых будоўляў: вялікага тэатра, гасцініцы ў Менску, ільнакамбіната ў Оршы, раду новых жыллёвых дамоў для рабочых. Даволі адставаць, таварышы будаўнікі! Змагайцеся за сканчэнне даручаных вам важнейшых аб'ектаў да дваццатай гадавіны Вялікага Кастрычніка. Арганізуйце соцыялістычнае спаборніцтва на лепшае і хутчэйшае правядзенне рамонту рабочых кватэр да зімы. Паляпшайце якасць будаўнічых і рамонтных работ.

Таварышы тарфянікі! Вы не дадалі краіне сотні тысяч тон торфу, вельмі доўга зы мірыцеся са сваім адставаннем. яно дорага абыходзіцца рэспубліцы.

Прыміце ўсе меры да найхутчэйшага перамагання адставання. Выкрыйце і знішчэнне пралезшых на вашы прадпрыемствы шкоднікаў. Пара ўжо даваць торфу столькі, колькі патрабуе наша соцыялістычная прамысловасць.

Рабочыя і інжынерна-тэхнічныя работнікі электрастанцый Менска, Гомеля, Белдрэса і інш. Арганізуйце большэвіцкую барацьбу за ліквідацыю вынікаў школніцтва. Узорна падрыхтуйце станцыі да зімы. Стварыце неабходны запас апалу, добра адрамантуйце агрэгаты. Памятайце, што ад бесперабойнай работы электрастанцый залежыць работа большасці прамысловых прадпрыемстваў, транспарту, асвятленне жыллёў працоўных нашай рэспублікі.

Таварышы кіраўнікі наркаматаў, трастаў, прадпрыемстваў! Таварышы інжынеры, тэхнікі, адміністратыўныя работнікі! Ад вас мы патрабуем перабудовы ў кіраўніцтве прамысловасцю. Узначальце барацьбу за самую хуткую ліквідацыю вынікаў шкодніцтва. Станьце сапраўднымі важакамі стаханаўскага руху. Хутчэй выкарчоўвайце канцылярска-бюракратычныя металы кіраўніцтва. Наблізьцеся да цэхаў, брыгад і асобных рабочых. Падсмотрайце скарыстанне вопыту перадавікоў і смела вылучайце новыя, праверэныя большэвіцкія кадры на кіруючую работу».

Беларускі народ атрымаў велізарную дапамогу ад партыі і ўрада. Таварыш Сталін неаслабна сочыць за развіццём рэспублікі і дапамагае беларускаму народу хутчэй ліквідаваць вынікі шкодніцтва. У адказ на гэтыя клопаты працоўныя Совецкай Беларусі высока падымаюць сцяг соцыялістычнага спаборніцтва, рыхтуючыся сустрэць дваццатую гадавіну Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі новымі перамогамі.

У гэтым вялатным руху, які шырыцца з кожным днём, на жаль, не відаць ролі інжынерна-тэхнічнага персаналу фабрык і заводаў. Да гэтага часу яны яшчэ не арганізавалі дзейснай дапамогі стаханаўцам. Толькі асобныя інжынеры і тэхнікі ідуць у нагу са стаханаўцамі, астатнія-ж працуюць яшчэ жыць па-старыцы, яшчэ «раскачваюцца». Некаторыя з інжынерна-тэхнічных работнікаў не зразумелі яшчэ прагрэсіўнага характару стаханаўскага руху. Гэтым таварышам трэба ўсяк дапамагчы перамагчы іх вузасць. Але ёсць на нашых прадпрыемствах і ўпорствуючыя кансерватары. Гэты кансерватызм часта служыць прыкрыццём, маскай для шкоднікаў, якія прабуюць сарваць стаханаўскі рух. Задача нашых партыйных арганізацый, усіх партыйных і непартыйных большэвікоў — выкрыць гэтых шкоднікаў, убраць перашкоды з шляху развіцця стаханаўскага руху.

«Прыязецца ў першую чаргу, — гаворыць таварыш Сталін, — перакананаць, цярпліва і па-таварыску пераконваць, гэтыя кансерватыўныя элементы ў прамысловасці, — у прагрэсіўнасці стаханаўскага руху і ў неабходнасці перабудавацца на стаханаўскі лад. А калі пераконанні не дапамогуць, прыдзецца прыняць больш рашучыя меры».

Гэты прынцып павінен быць кіруючым для ўсіх партыйных арганізацый, асабліва зараз, калі стаханаўскі рух у Беларусі, пасля ляжкіх ударaў, нанесеных яму польскімі шпікамі, шкоднікамі і дыверсантамі, зноў пачынае падымацца ўгару.

ПРАМОВА таварыша М. М. ЛІТВІНАВА

ЖЭНЕВА, 21 верасня. (БЕЛТА). Сёння раніцай на пленуме Лігі нацый выступіў першы дэлегат СССР таварыш М. М. Літвінаў. Таварыш Літвінаў сказаў:

«Пан старшыня, панове,

павінен прызнацца, што я адчуваў некаторыя хістанні, перш чым выступіць тут, і я думаю, што тыя-ж хістанні не чужды і іншым дэлегацыям. Я пытаў сябе: хіба не захоўвае поўнасцю сваю сілу ўсё тое, што намі гаварылася і прапаноўвалася з гэтай трыбуны год таму назад па повалу даклада 17-й асамблеі і ці трэба што-небудзь да гэтага дадаць? На самай справе: зло, аб якім мы тут тады гаварылі, паранейшаму атручвае міжнародную атмасферу і раз'ядае Лігу нацый. Агрэсія, у тэорыі і ў дзеянні, не толькі не знікла, а наадварот, яшчэ вышэй падняла галаву, яшчэ наглей паказвае свой агідны твар і знаходзіць усё новыя і больш частыя праяўленні і ва ўсё больш рэзкай форме.

Да агрэсіўных з'яў у замаскіраванай форме на паўднёвым захадзе Еўропы прыбавіліся такія-ж з'явы ў голым выглядзе на азіяцкім кантыненце. Дзве дзяржавы, два члены Лігі і Совета падвяргаюцца нападу чужаземных ваенных сіл — сухапутных, марскіх і паветраных. Камерцыйныя, як і ваенныя, караблі трэціх краін становяцца афярамі рознастайных нападаў. Галоўнейшыя водныя шляхі сталі небезпаснымі ад піратства, марскага і паветранага. Наносіцца шкода міжнароднаму гандлю, каштоўныя грузы незаконна канфіскуюцца і пускаюцца на дно, каманды суднаў бяруцца ў палон ці знішчаюцца, на морах пануе паўнейшае свавольства і разбой, топчуцца нагамі элементарнейшыя нормы міжнароднага права.

Днямі прышлося стварыць міжнародную морскую паліцыю і выпрацаваць правілы гуманізацыі вайны ў мірны час.

На азіяцкім матэрыку без абвяшчэння вайны, без усякага повалу і апраўдання адна дзяржава нападае на другую — па Кітай, навалняе яго статысячнымі арміямі, блакіруе яго берагі, паралізуе гандаль у адным з буйнейшых сусветных камерцыйных цэнтраў. І мы знаходзімся, відаць, толькі ў пачатку гэтых дзеянняў, прапяг і канец якіх не паддаюцца яшчэ ўліку. У Еўропе другая дзяржава — Іспанія — ужо другі год прадаўжае падвяргацца нападу арганізаваных замежных армій, яе чароўная сталіца — Мадрыд і іншыя гарады падвяргаюцца з дня на дзень самай жорсткай бамбардыроўцы, якая знішчае дзесяткі тысяч чалавечых жыццяў, велізарныя матэрыяльныя і культурныя каштоўнасці. Другі горад — Альмерыя — падвяргаецца кананадзе з замежных ваенных суднаў; і ўсе гэтыя дзеянні робяцца замежнымі дзяржавамі, якім не павінна было быць ніякай справы да грамадзянскай вайны, што адбываецца ў Іспаніі.

Дарэмна сталі-б мы шукаць адлюстравання гэтых падзей у дакладзе сакратарыята Лігі цяперашняму пленуму. Ліга нацый, закліканая гарантаваць пласнасць дзяржаў, якія з'яўляюцца яе членамі, ахоўваць мір і міжнародны парадак, забяспечыць захаванне непарушэння міжнародных дагавораў і павагі да міжнароднага права, астаецца ў старане ад гэтых падзей, не рэагуючы на іх. Горш таго, умацоўваецца думка аб неабходнасці, галоўным чынам, ахоўваць ва што-б там ні стала Лігу нацый, як красную даяўчыну, ад дунавення гэтых патрасаючых падзей, ізаліруючы яе ад іх.

У аснове такой пяшчотнай клапатлівасці аб Лізе нацый ляжыць памылковая думка аб тым, што Ліга нацый не можа змагацца з агрэсіяй, свавольствам, беззаконнем і міжнародным разбоем, з прычыны адсутнасці ў ёй віноўнікаў гэтых з'яў. Мяркуюць, што барацьба з агрэсіяй можа быць паспяховай толькі... у супрацоўніцтве з самім агрэсарам. Вопыт такога паспяховага супрацоўніцтва ўжо праблем. Іспанскае пытанне было знята з Лігі нацый і перадана ў спецыяльна створаны лонданскі камітэт так званага неўмяшання, каб атрымаць супрацоўніцтва галоўных віноўнікаў іспанскай трагедыі, якія не выносяць жэнеўскага духу. Рэзультаты гэтага вопыту ў наяўнасці і ўсім вядомы. Падпісваліся пагадненні, якія неадкладна парушаліся, прымаліся рэзалюцыі, якія не выконваліся, выпрацоўваліся схемы і планы, якія сабатаваліся і зрываліся, і ўсё гэта пад акампанемент бразгання дзвярыма некаторымі няўмеру, але салідарна капрызнічаўшымі членамі камітэта, то пакідаўшымі яго, то зноў тулы вяртаўшыміся. Лонданскі камітэт не ласягнуў, вядома, ні адной з пастаўленых ім сабе мэт. Пры фармальнай забароне вываз зброі ў Іспанію, снабжэнне мяжнікіраў усімі відамі зброі для дзеянняў на сушы, на моры і ў паветры — у дзяржаўным маштабе — не спыняліся. Наперакор абавязацельству аб забароне замежным грамадзянам выезду ў Іспанію для ўдзелу ў ваенных аперацыях, дзесяткі тысяч людзей у ваенных фармацыях, пялымі дывізіямі ў поўным узбраенні на чале з афіцэрамі і генераламі дастаўляліся ў дапамогу іспанскім мяжнікам на вілавоку ўсіх непасрэдна з портаў краін, узяўшых на сябе памянёнае фармальнае абавязацельства. Гэта — не здагадкі, а факты, якія не скрываюцца самімі парушальнікамі гэтых абавязацельстваў, і аб якіх адкрыта піша іх прэса, аб якіх мы даведваемся з афіцыяльных загадаў, з друкуемых спісаў раненых і забітых, з абмену афіцыяльнымі тэлеграмамі. Дадайце да гэтага крэйсіраванне вакол Іспаніі замежных ваенных суднаў, якія дапамагаюць мяжнікам сваёй развядкай, абстрэлам іспанскіх портаў (выцалак з Альмерыяй) і нават затапленнем нейтральных камерцыйных суднаў, г. зн. удзелам у блакадзе рэспубліканскай Іспаніі, і вы зразумееце, чаму аб неўмяшанні ў іспанскія справы нельга больш гаварыць без іроніі.

Такія рэзультаты дзейнасці арганізацыі, вызваленай ад духу Жэневы і адпавядаючай патрабаванню універсальнасці.

Я рэкамендую гэтыя рэзультаты ўвазе апалагетаў універсальнасці. Няхай яны прызадумаюцца над прычынай гэтых рэзультатаў, і яны пераканаюцца ў ілюзорнасці надзей на паспяховае супрацоўніцтва паміж дзяржавамі, якія маюць розныя мэты, маюць процілеглыя канцэпцыі аб міжнародным жыцці, аб правах і абавязках народаў паміж сабой, надзей на супрацоўніцтва паміж шчырымі прыхільнікамі неўмяшання ва ўнутраныя справы іншых дзяржаў, абаронцамі права кожнага народа на самастойнае вызначэнне свайго ўнутранага рэжыма і такімі-ж шчырымі і адкрытымі прыхільнікамі ўмяшання ў чужыя справы і навязвання іншым дзяржавам таго ці іншага рэжыма штыхом і бомбай. Паміж агрэсіяй і не-агрэсіяй, паміж мірам і вайной не можа быць сінтэзу.

З другога боку, мы мелі вопыт двух канферэнцый у Монтрэ і зусім нядаўні ў Ніёне, удачна і хутка выканаўшых свае задачы, не глядзячы на адсутнасць універсалізма, г. зн. адсутнасць тых дзяржаў, пад прыцягненнем якіх звычайна разумеецца тут універсалізм. Вывад напрошваецца сам сабой. Справа не ў універсалізме, а ў тым, каб удзельнікі ўсякай міжнароднай арганізацыі ці канферэнцыі пры ўсёй розніцы іх нацыянальных інтарэсаў былі аб'яднаны агульнай яднаючай іх універсальнай ідэяй, якою з'яўляецца ідэя міру, ідэя павагі самастойнасці і незалежнасці ўсіх народаў, ідэя выгнання сілы як зброі нацыянальнай палітыкі, ідэя, пакладзеная ў аснову статута Лігі нацый і пакта Брыяна-Келага.

Мы ведаем тры дзяржавы, якія адмежаваліся ад гэтай ідэі і на працягу апошніх год учынялі напады на іншыя дзяржавы. Пры ўсёй розніцы рэжымаў, ідэалогій, матэрыяльнага і культурнага узроўню аб'ектаў нападу, у апраўданне агрэсіі ўсімі трыма дзяржавамі прыводзіцца адзін і той-жа матыў: барацьба з комунізмам.

Кіраўнікі гэтых дзяржаў наіўна думаюць, ці хутчэй робяць выгляд, што думаюць, што варта ім вымавіць слова «антыкомунізм» — і ўсе іх міжнародныя злодзейні і злачынствы павінны быць праваны. Хоць яны хвалюцца, што ім удалося выкараніць комунізм у іх уласных краінах і што яны атрымалі поўны імунітэт ад яго, яны ў парыве невычарпальнай любві да бліжніх і дальніх народаў аб'яўляюць сваёй місіяй збаўленне гэтых народаў ад комунізма. Пры дапамозе ідэйнай барацьбы? О, не. Пры дапамозе ўсіх ваенна-паветраных, наземных і морскіх сіл, якія знаходзяцца ў іх распараджэнні.

Яны, у выкананне сваёй добраахвотна ўзятай на сябе місіі па ашчасліўленню ўсіх народаў, гатовы не шкадаваць ніякіх сіл і сродкаў свайго ўласнага народа, гатовы скараціць да мінімума яго элементарнейшыя матэрыяльныя патрэбнасці і пасадзіць яго на галодны паёк, толькі-б мець дастаткова зброі для выкаранення ў іншых краінах комунізма. Гэта, вядома, адкрытая ідэалогія ўзброенага ўмяшання ва ўнутраныя справы іншых народаў, поўнай пагарды да іх самастойнасці і незалежнасці.

Я вас пытаю, як-бы выглядзеў свет, калі-б гэтай ідэалогіяй праніклася іншыя народы і іншыя паходам адзін на другога дзеля навязвання адзін другому таго ці іншага ўнутранага рэжыма. Між іншым, часам заснавальнікі гэтай ідэалогіі самі пачынаюць сумняваецца ў яе пераканальнасці і прымальнасці ў якасці кіруючай міжнароднай ідэі. Яны тады спускаюцца са сваіх ідэалагічных вышынь і даюць нам больш празаічнае тлумачэнне сваіх антыкомуністычных лозунгаў. Мы тады даведваемся, — чаго мы не знойдзем у энцыклапедычным слоўніку, — што антыкомунізм мае таксама геалагічны сэнс і азначае пагу да волава, цынка, ртуці, мелзі і іншых мінералаў. Калі-ж і гэта тлумачэнне аказваецца недастатковым, тады антыкомунізм расшыфроўваецца, як прага выгаднага гандлю. Нам гаворыць, што такога гандлю можна пазбавіцца, калі Іспанія афарбуецца ў комуністычны колер. Я сумняваюся, аднак, каб гэта былі самыя апошнія і выключныя тлумачэнні антыкомунізма.

Мы-ж ужо ведаем прыклад адной комуністычнай дзяржавы, багатай мінераламі і інш. сыравінай, якая не адмаўлялася вывозіць гэтыя мінералы і сыравіну ў іншыя краіны, весці з апошнімі вельмі шырокі гандаль пры любых рэжымах, панаваўшых у гэтых краінах, уключаючы нават рэжым фашысцкі і нацыянал-соцыялісцкі. Больш таго, гэтыя-ж краіны вельмі ахвотна атрымлівалі ад комуністычнай дзяржавы мінералы і іншую сыравіну, не толькі не адмаўляючыся ад гандлю з ёю, але і імкнучыся да максімальнага расшырэння гэтага гандлю, прапануючы найбольш выгадныя для гэтага ўмовы.

Мы бачым, такім чынам, што комунізм не з'яўляецца перашкодай міжнароднаму тавараабмену э любой дзяржавай пры ўмове, вядома, што апошняя захоўвае хоць элементарныя міжнародныя прыстойнасці, не лаецца па-базарнаму, не хуліганствуе і не заяўляе адкрыта, што выгады ад гандлю пойдуць на павелічэнне ўзбраенняў для нападу на контрагента.

Але любое тлумачэнне антыкомунізма да рэспубліканскай Іспаніі непрыстасоўна і таму, што там комуністычнага ладу не было і няма і што, наколькі нам вядома, іспанскі народ змагаецца за захаванне свайго рэспубліканска-дэмакратычнага рэжыма, супроць сіл рэакцыі і ваеннай дыктатуры. Вось чаму прыходзіцца думаць, што ў далейшым мы атрымаем новае ці дадатковае тлумачэнне антыкомунізма, можа быць, у галіне палітычнай, стратэгічнай ці іншай.

Неабходна дадаць, што плоскасць прыложэння антыкомуністычнага лозунга ўсё больш і больш расшыраецца. Калі цяпер гаворыць аб большэвіцкім рэжыме, які падлягае выкараненню, то часта дадаюць словы «і таму падобныя рэжымы». Прыходзіцца нярэдка чуць, што ўсе дэмакратычныя парламенцкія краіны знаходзяцца напярэдадні большэвізацыі. Адсюль недалёка да сцвярджэння аб неабходнасці

(Працяг на 2-й стар.)

ПРЫЕЗД ЗАМЕЖНЫХ ДЭЛЕГАЦЫЙ

РАЁН МАНЕЎРАЎ, 21 верасня. (БЕЛТА). У раён манёўраў часцей Беларускай ваеннай акругі прыбылі ваенныя дэлегацыі латвійскай, літоўскай і эстонскай армій.

Дэлегацыі былі сустрэты ў раёне манёўраў начальнікам штаба Беларускай ваеннай акругі камдзівам Перамытавым, ч. в. аб. начальніка аддзела замежных зносін Наркамата абароны камбрыгам Мацэйлікам.

Ваенныя дэлегацыі ў суправаджэнні камбрыга Мацэйліка, маёра Дубініна і маёра Осетрова былі прыняты камандуючым войскамі Беларускай ваеннай акругі камандармам 1-га ранга Беловым і членам Ваеннага совета БВА армейскім камісарам 2-га ранга Мезісам.

НАРАДА БІБЛІЯТЭЧНЫХ РАБОТНІКАЎ

Учора адбылася скліканая рэдакцыяй газеты «Звязда» нарада бібліятэчных работнікаў г. Менска і асобных прыгарадных раёнаў сумесна з прадстаўнікамі ДВБ і кнігагандлюючых арганізацый. Нарада абмеркавала пытанне аб становішчы і задачах работы бібліятэк у сувязі з падрыхтоўкай да 20-годдзя Кастрычніцкай рэволюцыі і выбараў у Вярхоўны Совет Саюза ССР.

Удзельнікі нарады ўзнялі цэлы рад пытанняў бібліятэчнай работы, патрабуючых неадкладнага вырашэння. Яны справядліва прад'явілі шмат патрабаванняў кнігагандлюючым арганізацыям і ДВБ, якія не арганізавалі дагэтуль забеспячэння бібліятэк кнігамі, на якія ёсць велізарны попыт чытача.

Падрабязныя матэрыялы нарады будуць апублікаваны дадаткова.

ПАЧАЛІСЯ МАНЕЎРЫ ЧАСЦЕЙ БЕЛАРУСКАЙ ВАЕННАЙ АКРУГІ

„ЗАХОДНІЯ“ — „УСХОДНІЯ“

РАЁН МАНЕЎРАЎ. (Спец. кар. «Звязды»). Ноч удалася нарэдка ціхай і лунай. Пад халоднымі праменнямі поўнай луны ўнізе крутога абрыву фантастычным серабром пераліваецца вада шырокай ракі. На лугу за ракой зідаць стагі сена. Нерухома застыўшыя ля берагу ракі плыты, вясёлая, жыццерадасная песня дзяўчат-калгаснік, якая эхам аддаецца ў суседнім лесе, і дзесьці ледзь чутныя гукі гармоніка надаюць гэтаму начному пейзажу выключна мірны і спакойны выгляд.

Але гэта так здаецца на першы погляд. Варта больш пільна прыглядзецца да кожнага ўскрайку лесу, да кожнага пералеску і аўрага, каб пераканацца, што кожная складка гэтай мірнай і ціхай мясцовасці схавала цэлыя падраздзяленні Чырвонай Арміі з іх магутнымі агнявымі тэхнічнымі сродкамі.

Тут «фронт». 20 верасня часці Беларускай ваеннай акругі вышлі на манёўры, каб замацаваць атрыманыя веды па баявой і палітычнай падрыхтоўцы і яшчэ лепш авалодаць складанай баявой тэхнікай.

Перад пачаткам вучэнняў у чырвонаармейскіх часцях былі праведзены мітынгі. Кожны баец, камандзір, палітработнік вышаў на палі вучэнняў з адзіным жаданнем: яшчэ раз праверыць свае ваенныя веды і боездольнасць складанай тэхнікі, якой так шчодра аснашчана наша Чырвоная Армія, каб у любы момант пры любых умовах быць гатовым граміць сапраўднага ворага на той тэрыторыі, адкуль ён паспрабуе напасці на нашу квітнеючую радзіму.

Старана «заходніх». Авангардны стралковы батальён, якім камандуе капітан Панасюга, атрымаў заданне ад камандавання часці заняць заходні бераг ракі Н., умацавацца там, знайсці выгодныя месцы для фарсавання ракі і весці пільны нагляд і разведку за «праціўнікам». Падраздзяленні батальёна піха прыблізіліся да крутога, парослага дробным бераздняком берагу, акапаліся, майстэрска замаскаваліся і занялі выходнае становішча. Нагляльнікі пачалі старанна сачыць за процілеглым берагам і засякаць выяўленыя агнявыя кропкі «праціўніка».

Аддзялённы камандзір Грыгор'еў, які месяц таму назад загадваў свінатаварнай фермай соўгаса імя Кірава (БССР), яшчэ раз шопатам тлумачыць побач з ім ляжачаму ў акопе байцу яго сектар прыстрэлу.

Пасля ён перапаўзае да наступнага бойца і вучыць яго, як лепш акапацца, каб у акопе было свабодна і ні што не перашкаджала весці меткі знішчаючы агонь. Трэцяму ён паказвае, як лепш маскавацца пры такой светлай лунай ночы.

— Большасць байцоў майго аддзялення, — расказвае нам т. Грыгор'еў, — з'яўляюцца пераменнікамі. У Чырвоную Армію яны прышлі месяц таму назад з калгасаў Совецкай Беларусі. Не глядзячы на гэты кароткі тэрмін, яны добра валодаюць баявой тэхнікай, з'яўляюцца трапнымі стралкамі і кожны з іх зараз прадстаўляе ляжка ўязвімую агнявую кропку.

Ён зноў непрыкметна перабягае да байцоў і пачынае ім яшчэ раз растлумачваць задачы фарсіравання ракі, якую «праціўнік» не здасць без бою.

***

Досвіткам пад густой дымавой завесай, пад прыкрыццём інтэнсіўнага артылерыйскага агню авангардныя часці «заходніх» асобнымі дэсантамі пачалі пераправаўляцца праз раку. «Усходнія» іх сустрэлі моцным кулямётным, артылерыйскім і ружэйным агнём. Пішыня раніцы нечакана запоўнілася аглушальнай незмаўкаемай кананадай і кулямётнай дробнай. Пры высадцы на процілеглы бераг першых атрадаў «заходніх» завязаўся моцны бой. Бачачы вялікую перавагу ў сілах, агнявых і тэхнічных сродках «праціўніка», «усходнія», чапляючыся за складкі мясцовасці і адстрэльваючыся, вымушаны былі адступіць да наступнага рубяжу. «Заходнія» пачалі іх праследаваць.

Стралковая рота «усходніх», якой камандуе старшы лейтэнант Казакін, заняла выгодны рубеж на ўскрайку лесу. Дасканалыя натуральныя і штучныя ўмацаванні, маскіроўка і да таго-ж забалочаны луг наперадзе фронта зрабілі яго слаба ўязвімым. Кулямётчыкі, стралкі, гранатамётчыкі сваім трапным знішчальным агнём доўгі час стрымлівалі наступленне ў некалькі раз большых сіл «заходніх».

Малодшы камандзір Рогаў, ведучы назіранне за перабягаючай па фронту пяхотай «заходніх», халоднакроўна дае чоткую каманду аддзялённым камандзірам:

— Па перабягаючаму праціўніку агонь!

Зноў захлёбваюцца кулямёты, агонь якіх прымушае наступаючага «праціўніка» ўкрывацца і стрымлівае яго імклівае наступленне.

Усё-ж пад націскам пераважаючых сіл «заходніх» рота павінна была павольна адкатвацца і з гэтага ўмацаванага рубяжу ў далейшым выдатна ведучы абарону, рота старшага лейтэнанта Казакіна ўвесь час затрымлівала і заблытвала наступленне «заходніх».

Усе яны і «заходнія» і «ўсходнія» — гэта доблесныя сыны нашай роднай непераможнай Чырвонай Арміі. На палях манёўраў байцы, камандзіры і палітработнікі паказваюць сваё майстэрства валодаць складанай баявой тэхнікай, паказваюць смеласць і адвагу, рыхтуючы з сябе верных стражаў заваяванняў Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі.

Н. ВІШНЕЎСКІ.

ПРАМОВА таварыша М. М. ЛІТВІНАВА

ашчасліўлення і выратавання іх ад пагражаючай ім гібелі, як і ў выпадку з Іспаніяй, шляхам узброенага ўмяшання і нападу.

Мы маем прыклад Кітая, які наўрад ці можна аднесці нават да ліку краін з парламенцкім рэжымам у строгім сэнсе гэтага слова. Тым не менш напад на яго таксама робіцца пад лозунгам барацьбы з комунізмам. Мы бачым і ў самой Еўропе, як краіны, намечаныя, на агульную думку, аб'ектам бліжэйшай агрэсіі, загадзя аб'яўляюцца большэвізаванымі ці падпаўшымі пад большэвіцкі ўплыў з мэтаю далейшага апраўдання намечанай агрэсіі. Любая краіна, якая стала-б аб'ектам прагнасці агрэсіўных дзяржаў, можа быць аб'яўлена падазронай па большэвізму, бо ніякіх доказаў не патрабуецца, а даволі толькі з дня на дзень паўтараць адно і тое-ж у ўніфікаваным друку і ў афіцыяльных прамовах, выходзячы з дапушчэння, што няпраўда можа здавацца праўдай пры частым яе паўтарэнні.

Я ўпэўнен, што ўсе разважлівыя людзі вельмі добра разумеюць недарэчнасць антыкомуністычнага лозунга і тыя агрэсіўныя пабуджэнні, якія ім маскіруюцца, але з ветлівасці, наўрад ці ўменсная у даным выпадку, моўчкі выслухоўваюць і прачытваюць гэту недарэчнасць. Небяспека заключаецца ў тым, што гэта маўчанне можа быць зразумета агрэсарам як згода з апраўданасцю яго агрэсіўных намераў ці дзеяннях у усімі вынікамі адсюль сумнымі вынікамі для справы міру. Я думаю, што пара пакончыць з гэтай небяспечнай агітацыйнай зброяй агрэсіі, што час тым, каму сапраўды дарагі інтарэсы міру, сказаць высокапастаўленым дзяржаўным папугаям, што недарэчнасць, паўтараемая з дня на дзень, не перастае ад гэтага быць недарэчнасцю, што агрэсію трэба называць агрэсіяй, якім-бы лозунгам яна ні ўпрыгожвалася, што які-б ні быў сэнс антыкомунізма—мінералагічны, камерцыйны, стратэгічны ці іншы—не могуць атрымаць міжнароднага апраўдання, прыкрываемыя ім агрэсія, узброенае ўмяшанне, урыванне ў чужыя дзяржавы і парушэнне міжнародных дагавораў.

Пара таксама сказаць, што яны—прапаведнікі шалёнага чалавеканенавісніцтва—не смеюць змагацца за інтарэсы чалавецтва, што яны—уваскрасіцелі самай дзікай, аджыўшай тэорыі часоў язычэства і сярэдневякоўя — не смеюць гаварыць ад імя сучаснай Еўропы, што яны—зжыгальнікі лепшых твораў чалавечага духу, ганіцелі самых бліскучых прадстаўнікоў навукі, мастацтва і літаратуры, пагарджаемыя ўсім культурным светам, робяць сябе смешнымі, калі гавораць аб выратаванні цывілізацыі і заклікаюць у імя гэтага да крыжовых паходаў супроць іншых народаў.

Падобнымі заявамі была-б аказана найвялікшая ўслуга справе міру.

Днямі кампанія па апраўданню агрэсіі ў Іспаніі ўзбагацілася новым бязглуздым сцвярджэннем, быццам Совецкі Саюз імкнецца заваяваць Іспанію, ці па крайняй меры, забяспечыць палітычны ўплыў на Іспанію і тым парушыць раўнавагу ў Міжземным моры. Праўду сказаў тут днямі іспанскі прэм'ер-міністр п. Негрын, што Совецкі Саюз за ўвесь час іспанскага канфлікту ад Іспаніі нічога не прасіў, нічога не дабіваўся і нічога не дабіваецца. У Совецкага Саюза няма ў Іспаніі ні мінералагічных, ні эканамічных, ні стратэгічных інтарэсаў, ні нават меркаванняў так званай раўнавагі. Яго цікавіць выключна ўстанаўленне права кожнага народа вызначаць свой унутраны рэжым уласным рашэннем без умяшання замежных дзяржаў, а тым больш замежных войск, і недапушчэнне стварэння ў Іспаніі новага апорнага пункту для агрэсіі супроць усёй Еўропы.

Хоць совецкі ўрад з самага пачатку не прызнаваў і не прызнае па сучасны момант раўнапраўя старон у іспанскім канфлікце, ён тым не менш далучыўся да ўсіх пагадненняў аб неўмяшанні і да прапановы аб выключэнні з ваенных аперацый усіх не-іспанскіх элементаў. Заключаючы міжнароднае пагадненне, совецкі ўрад, натуральна, мае права клапаціцца аб тым, каб ён не быў ашуканым пры захаванні абавязковасці пагаднення для адных і фактычнай неабавязковасці для другіх.

Панове, аб пагрозах міру гаварыць цяпер не прыходзіцца, бо мір парушан ужо. Неабвешчаная вайна вядзецца на двух кантынентах, і водгукі і адбіткі яе трудна прадбачыць. І вось, калі мы збіраемся ў адзінай міжнароднай арганізацыі па ахове міру і пытаем сябе, што можна зрабіць для знішчэння міжнародных неладоў, для прыпынення адбыўшайся агрэсіі, для аказання эфектыўнай дапамогі яе афярам для прадухілення агрэсіі, якая пагражае іншым краінам, і для аздараўлення міжнароднай атмасферы, мы тут пачулі адказ: універсалізм — вось наш паратунак. Ёсць дзяржавы, якія ў Лігу нацый ніколі не ўваходзілі, ёсць такія, якія ўваходзілі і выходзілі; трэба запытаць тых і другіх,—ці не хочуць яны прысці або вярнуцца да нас і на якіх умовах і чым, на іх думку, Ліга павінна займацца. Да гэтага, на думку некаторых дэлегатаў, зводзяцца задачы дня.

Гэта пытанне намі абмяркоўвалася і на леташнім пленуме Лігі, і я тады-ж указаў на адсутнасць сярод нас прыхільнікаў універсалізма. Пытанне толькі ў тым, ці дасягальны ён, якой цаной, ці можа ён пры даных умовах даць станоўчыя рэзультаты і ці сапраўды Ліга без яго зусім бездапаможна. Мы ўсе не забываем ні на адну хвіліну і шчыра шкадуем аб адсутнасці ў Лізе такой магутнай вялікай дзяржавы, як Злучаныя Штаты Амерыкі. Мы ведаем глыбокую міралюбнасць амерыканскага народа, яго шчырую агіду да вайны. Мы ведаем адданасць ідэалам Лігі нацый цяперашняга прэзідэнта ЗША і дзяржаўнага сакратара. Мы ведаем, якую велізарную дадатковую сілу набыла-б Ліга ў асобе гэтай дзяржавы. Я лічыў-бы, аднак, непачціваснасцю ў адносінах яе думку аб тым, што яна гатова стаць членам Лігі, але чакае толькі нашага запытання ці запрашэння, каб самой не зрабіць першага шагу. Буйная, усведамляючая сваю магутнасць дзяржава не можа кіравацца падобнага роду дробнымі прэстыжнымі меркаваннямі. Я пераконан, што калі-б амерыканскі ўрад знаходзіў магчымым далучыцца да Лігі нацый на якіх-небудзь умовах, то ён не стаў-бы чакаць нашага запытання ці запрашэння і знайшоў-бы шляхі, каб нам аб гэтым даць ведаць. Іншымі не могуць быць адносіны да гэтага пытання ўсякай іншай буйнай дзяржавы, якой дарагі інтарэсы міру і міжнароднага супрацоўніцтва.

Паважаны прадстаўнік Чылі нам назваў тут некалькі паўднёва-амерыканскіх дзяржаў, якія ўсяго год ці два таму назад пакінулі Лігу, як Гандурас, Гватэмала, Сальвадор, Нікарагуа і Парагвай. Мы шкадуем аб іх выхадзе, бо мы пэнім супрацоўніцтва ўсіх краін, вялікіх і малых. Я не думаю, аднак, што і паважаны прадстаўнік Чылі мог думаць, што зварот ва ўлонне Лігі нацый гэтых некалькіх дзяржаў з'явіўся-б ключом да вырашэння праблем, якія стаяць перад намі, і што мнімая бездапаможнасць Лігі выцякае ад іх адсутнасці. Я схілен думаць, што, гаворачы аб універсалізме, маюць на ўвазе пераважна тыя імённа тры вялікія дзяржавы, якія ўжо былі ў Лізе і бразнулі дзвярыма і палітыку якіх я вам толькі-што ахарактарызаваў. Нам рэкамендуюць запытацца аб тым, як Лізе лепш за ўсё змагацца з агрэсіяй, забяспечыць самастойнасць і незалежнасць усіх членаў Лігі — запытаць тыя дзяржавы, якія адкрыта прапаведвалі, прапаведваюць і практыкуюць агрэсію і ўзброенае ўмяшанне ў справы іншых дзяржаў і неабавязковасць міжнародных дагавораў. Хіба ўся іх палітыка не з'яўляецца красамоўным адказам на мяркуемае запытанне? Хіба яны скрываюць свае адмоўныя адносіны да калектыўных мер барацьбы з агрэсіяй? Хіба яны не маюць на мэце прадаставіць кожную дзяржаву свайму ўласнаму лёсу, прызнаючы ўзаемную дапамогу толькі ў агульнай агрэсіі? Хіба гісторыя лонданскага камітэта па неўмяшанню не дае нам дастаткова яснага ўяўлення аб тым, як яны разумеюць калектыўныя абавязацельствы і выкананне іх?

Нарэшце, мы даволі знаёмы з перапіскай і перагаворамі апошніх год у сувязі з парушэннем лакарнскага дагавору, каб ведаць, што рэкамендуемае нам цяпер запытанне аб магчымасці звароту ў Лігу і нават аб умовах гэтага звароту даўно ім паслана. Я не памятаю, ці быў дан адказ на гэтае запытанне, я не ведаю, ці будзе адказ на эвентуальнае запытанне ад імя Лігі, але калі ён і будзе дан, то, як-бы ён ні быў сфармулёван, яго сэнс можа быць толькі адзін: у Лігу мы не вернемся ці гатовы вярнуцца пры ўмове, што яна не будзе перашкаджаць нашым агрэсіўным планам, што Ліга адмовіцца ад абароны сваіх членаў, прызнае расавую іерархію народаў, права панавання адных над другімі і навязвання апошнім рэжыма першых. Ці патрэбен універсалізм у такіх умовах? Не сумняваюся ў адказе на гэта пытанне большасці членаў Лігі.

Пытанне аб універсалізме ўзнікла ў сувязі з пастаўленай перад намі задачай рэформы Лігі. Згодна рэзалюцыі, прынятай надзвычайным пленумам, рэформа пазінна быць праведзена ў напрамку ўзмацнення Лігі, павышэння яе эфектыўнасці ў барацьбе з агрэсіяй. У адказах, атрыманых на анкету ад членаў Лігі, ёсць дастаткова каштоўных указанняў і прапаноў, на падставе якіх мы можам непасрэдна прыступіць да работы і закончыць яе, вядома, пры наяўнасці добрай волі. Але, калі ўзмацненне Лігі не адпавядае жаданням усіх яе членаў, а аб гэтым як-быццам сведчылі прапановы аб звароце да ахарактарызаваных не-членаў Лігі, то бескарысна і німэтазгодна прадаўжаць пачатую работу. Лепш адкласці яе да лепшых часоў, бо ў цяперашнім яе выглядзе Ліга астаецца нямалаважным элементам патэнцыяла міру.

Рэформа Лігі ва ўсякім выпадку патрабуе шмат часу, а цяперашняму пленуму прадстаіць вырашэнне вялікіх надзённых праблем. Мы маем заклік аб дапамозе двух членаў Лігі — афяр агрэсіі. Гэты заклік ставіць Лігу перад вялікім іспытаннем. Яна не можа захаваць які-б та ні было аўтарытэт захаваць нават сваё існаванне, бясконца адхіляючыся ад выканання сваіх абавязацельстваў і рэгіструючы сваю бездапаможнасць. Я пераконан, што Ліга нацый і ў яе цяперашнім складзе можа аказаць як Іспаніі, так і Кітаю больш моцную дапамогу, чым гэтыя краіны скромна ад яе просяць, і гэтым яна ніколькі не павялічыць, але зменшыць шансы новых міжнародных ускладненняў. Мы рызыкуем толькі выклікаць незадаволенне—і можа быць нават велізарнае незадаволенне,—вінаўнікаў цяперашняга міжнароднага хаасу, падвергнуцца нападу з боку іх бесшабашнай прэсы. Я ведаю, што многія вельмі чулы да думкі гэтай прэсы, якая гэтаксама празакацыйна і агрэсіўна ў сваіх метадах, як і ўрады, якія даюць ёй загады. Але я лічу за лепшае што-небудзь зрабіць для таго, каб захаваць жыцці дзесяткаў і сотняў тысяч афяр эвентуальнага расшырэння ці працягу агрэсіі, чым шкадаваць пачуццё самалюбства агрэсараў.

Панове, што можа і павінна рабіць Ліга перад тварам агрэсіі? Мы ведаем сентэнцыю аднаго англійскага пісьменніка, што лепшы спосаб збавіцца ад спакусы — гэта ўступіць ёй. Я ведаю, што ёсць такія палітычныя мудрацы, якія думаюць, што і ад агрэсіі лепш за ўсё збавіцца шляхам уступак ёй. Яны папракаюць іспанскі народ за гераічнае супраціўленне, якое ён аказвае мяцежным генералам і дзяржавам, якія стаяць за імі. Яны думаюць, што і Кітай зрабіў-бы мудра, калі-б ён без бою ўступіў ультыматыўным патрабаванням агрэсара і дабравольна стаў яго васалам. Але Ліга нацый не для таго існуе, каб даваць падобныя парады; не апраўдаецца існаванне Лігі нацый і ў тым выпадку, калі яна, устрымліваючыся ад падобных парад, сама астанецца пасіўнай, са спасылкай на сваю слабасць, на сваю недастатковую універсальнасць, на няўдзел у яе абмеркаваннях вінаўнікаў агрэсіі, якія не жадаюць падпарадкавацца яе рашэнням. Гэты шлях быў ужо выпрабаван і прывёў да становішча, якое ўсе аратары на гэтай трыбуне аплакавалі. Гэты шлях прывёў да страт аднымі дзяржавамі — членамі Лігі вялізнейшых тэрыторый з дзесяткамі мільёнаў насельніцтва, з другімі — самога свайго існавання ў якасці дзяржавы. Можна лічыць цяпер аксіёмай, што пасіўнасць Лігі ў часе манчжурскага канфлікту мела сваім вынікам праз некалькі год напад на Асібінію. Недастатковая актыўнасць Лігі ў выпадку з Абісініяй заахвоціла іспанскі эксперымент. Непрыняцце Лігай ніякіх мер у дапамогу Іспаніі заахвоціла новую атаку на Кітай. Такім чынам, мы мелі чатыры агрэсіі на працягу пяці год. Мы бачым, як агрэсія, не будучы прыпынена, перакідаецца з аднаго матэрыка на другі, прымаючы кожны раз усё большыя і большыя размеры.

З другога боку, я цвёрда пераконан, што рашучая палітыка Лігі ў адным выпадку агрэсіі збавіла-б нас ад усіх астатніх выпадкаў. І толькі тады, ўсе дзяржавы пераканаліся-б, што агрэсія нерэнтабельна, што агрэсію не трэба прадпрымаць.

Толькі ў рэзультаце такой палітыкі ў нашы дзверы пастукаюцца былыя члены Лігі нацый, і мы ім радасна скажам: «Увайдзіце». Мы іх не запытаем аб іх светапоглядзе, аб пануючых у іх унутраных рэжымах, бо Ліга нацый прызнае мірнае суіснаванне любых існуючых рэжымаў, і калі ажыццявіцца наш агульны ідэал універсальнай Лігі, якая захавалася ў якасці зброі міру. Але гэтага ідэалу мы не дасягнем рассылкаю анкет, а дасягнем толькі калектыўным адпорам агрэсіі, калектыўнай абаронай міру, які нам усім неабходны і здабыткамі якога мы ўсе будзем карыстацца».

***

Пасля прамовы тав. Літвінава з усіх старон разляліся дружныя апладысменты, і шмат дэлегатаў паспяшыла павіншаваць яго з выдатным выступленнем У кулуарах дэлегаты і журналісты падыходзілі да членаў совецкай дэлегацыі і да прадстаўнікоў совецкага друку, заяўляючы, што гэта — самая моцная прамова, якую яны калі-небудзь чулі за ўсе гады існавання Лігі. Нават звычайна непрыязна настроеныя ў адносінах совецкай дэлегацыі колы прызналі, што прамова зрабіла найглыбейшае ўражанне.

ПЕРАД БАМБАРДЫРОЎКАЙ НАНКІНА

ЛОНДАН, 20 верасня. (БЕЛТА). Як паведамляюць з Шанхая, камандуючы азіяцкай эскадрай амерыканскага флота адмірал Ярнэл адмовіўся адвесці ад Нанкіна амерыканскія ваенныя судны «Люзон» і «Гуам» і папрасіў японскага адмірала Хасегаву інструктаваць японскіх лётчыкаў «пазбягаць гэтых караблёў» пры бамбардыроўцы Нанкіна (сталіцы Кітая).

НА МЕНСКАЙ ГАРАДСКОЙ НАРАДЗЕ СТАХАНАЎЦАЎ

ПРАМОВА тав. ЛЕВІНА

(СТАХАНАВЕЦ ЗАВОДА «БОЛЬШЭВІК»)

Рыхтуючыся да сустрэчы гадавіны Вялікай пролетарскай рэволюцыі, калектыў рабочых і служачых завода «Большэвік» шырока разгарнуў соцспаборніцтва. 400 соцдагавароў заключана паміж рабочымі і 21 паміж інжынерна-тэхнічнымі работнікамі.

Завод абавязаўся да XX гадавіны Вялікай пролетарскай рэволюцыі выпусціць звыш плана прадукцыі на 275 тыс. руб.

Мы абавязваемся да 1 лістапада пусціць у ход машыну па адзёргванню шчаціны і забяспечыць павелічэнне прадукцыйнасці працы з 15 да 70 кілограмаў; пусціць у ход машыну па механізацыі адмочнай аперацыі і павялічыць прадукцыйнасць працы.

Мы маем на заводзе і рад недахопаў. Яшчэ не ліквідаваны вынікі шкодніцтва, якое мела месца на заводзе. Рамонт абсталявання ў нас робіцца дрэнна. Гэта прыводзіць да таго, што стаханаўцы не могуць даць той прадукцыйнасці, якую можна атрымаць на даным станку.

Адзін час цэлая брыгада прастаівала з-за дрэннай работы строгальнай машыны. У другім нумары строгальнай машыны механічны цэх паставіў вал, палітовыя падшыпнікі і ўстанавіў у вал такую шыйку, што ад аднаго ўдару яна вылецела. У трэцім нумары строгальнай машыны не так даўно ўставілі крывы вал.

Ці выпадковы гэтыя факты? Па-мойму, яны не выпадковы. На нашым заводзе мабыў рад дыверсійных актаў (пажар у машынным аддзяленні). Гэта гаворыць аб тым, што трацкісцка-бухарынскае атрэ'е арудуе, а мы яго яшчэ не выявілі.

Сход рабочых прапанаваў дырэктару стварыць рамонтную брыгаду, каб пакончыць з паломкамі абсталявання. Але брыгада яшчэ не створана.

Раней, у першапачатковы перыяд разгортвання стаханаўскага руху, адміністрацыя завода цікавілася работай стаханаўцаў, а цяпер яна пусціла стаханаўскі рух на самацёк.

Рабочы калектыў завода «Большэвік» заяўляе, што стаханаўскай большэвіцкай работай забяспечыць выкананне ўсіх узятых абавязацельстваў і Вялікую пролетарскую рэволюцыю сустрэне перамогай.

ПРАМОВА тав. ЗЕЛІКМАН

(СТАХАНАЎКА ФАБРЫКІ ІМЯ КРУПСКАЙ)

За час прадкастрычніцкага спаборніцтва многія ленты дасягнулі вялікіх поспехаў. Лента майстра Саўчук выконвае план на 120 проц. Затое 18 і 9 ленты адстаюць. Кіраўнікі фабрыкі не забяспечваюць іх поўнасцю работай. Вытворчыя нарады рэдка склікаюцца.

Якасць прадукцыі адстае. За ліпень наша фабрыка страціла з-за дрэннай якасці прадукцыі 16.900 руб. Праўда, у жніўні гэта сума значна зменшылася, але ўсё-ж ніхто нам не даў ніякага права траціць дзяржаўныя грошы і ператвараць добры матэрыял у брак.

На нашай фабрыцы ў большасці працуе моладзь. Мы ўсе з'яўляемся выхаванцамі і пітомцамі совецкай улады. Усіх нас выпеставала і дала нам заможнае жыццё наша комуністычная партыя і родны, любімы таварыш Сталін.

Калі мы даведаліся аб гнуснай, шкодніцкай контррэволюцыйнай дзейнасці ворагаў народа, не было прадзелу нашаму гневу.

Ад імя калектыва фабрыкі я клянуся ў тым, што мы прыкладзем усе намаганні, каб да канца выкарчаваць ворагаў народа і ўсіх тых, хто захоча падняць крывавую руку на нашу партыю, на нашых правадыроў.

ПРАМОВА тав. ЛЕПЕШКА

(СТАХАНАВЕЦ ЗАВОДА ІМЯ МОЛАТАВА)

Таварышы, наш завод імя Молатава адносіцца да ліку невыконваючых план. Чым гэта тлумачыцца? Можна падумаць, што прычына ў тым, што на нашым заводзе няма стаханаўцаў. Не, таварышы, у нас ёсць сотні стаханаўцаў, якія могуць выканаць вытворчы план. Але ў чым-жа прычыны? Прычыны ў тым, што рабочыя не маюць поўнай нагрузкі.

Я—рабочы другога пэха, пэха мяккай мэблі. У сярэднім выконваю норму на 200 проц. Нельга сказаць, што гэта лічба з'яўляецца максімальнай. Калі-б я меў поўную нагрузку, то, бясспрэчна, даў-бы значна больш. Уся бяда ў тым, што ў нас вельмі часта бываюць перабоі ў забеспячэнні матэрыялам.

Мы, стаханаўцы, рыхтуючыся да сустрэчы XX гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі, абавязваемся выканаць датэрмінова план і выйсці з ганебнага адставання. Але толькі няхай нас забяспечаць патрэбнымі дэталямі і матэрыяламі.

Я думаю, што калі кіраўніцтва нашага завода цалкам і поўнасцю будзе зацікаўлена дапамагчы стаханаўцам, а таксама усім рабочым, якія яшчэ не сталі стаханаўцамі, то наш завод, бясспрэчна, выйдзе з прарыву.

ПРАМОВА тав. КАБЕРНІК

(СТАХАНАВЕЦ ШВЕЙНАЙ ФАБРЫКІ «8 САКАВІКА»)

Уключыўшыся ў прадкастрычніцкае спаборніцтва, наша фабрыка заключыла дагавор з фабрыкай імя Крупскай. Але, к вялікаму сораму, мы яшчэ ні разу не правяралі выкананне дагавору. Пасля гэтага злёту мы абавязкова яго праверым і ўзмоцнім спаборніцтва.

Ворагі народа арудвалі таксама і на нашай фабрыцы. Яны хацелі сарваць выкананне вытворчай праграмы, але ім гэта не ўдалося. У адказ на іх подлую дзейнасць у цэхах разгарнулася соцыялістычнае спаборніцтва як індывідуальнае, так і паміж брыгадамі.

З 16 брыгад 12 ужо выконваюць свае заданні. Брыгады майстраў Чаплінскага, Глікмана, Гутмана значна павялічылі сваю выпрацоўку. Пяць стаханаўцаў сталі двухсотнікамі. Дзесяць брыгад абавязаліся да XX гадавіны Кастрычніка стаць стаханаўскімі.

Кожная брыгада ўзяла абавязацельства па ўзмацненню абароннай работы. Арганізаваны чатыры гурткі па вывучэнню і здачы норм на значок «ПШХА».

У нас яшчэ ёсць многа непаладкаў. Чатыры брыгады не выконваюць план. Машыны часта прастайваюць і не рамантуюцца своечасова. Аб гэтым вельмі многа гаворацца на вытворчых нарадах, але адміністрацыя дагэтуль ніяк не ліквідуе прастоі.

Я абавязваюся да дня Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі навучыць 6 чалавек стаханаўскім метадам работы.

У ЧАВУСКІМ РАЕНЕ АРУДУЮЦЬ ВОРАГІ

8 лютага 1937 года селькор Д. паведаміў у рэдакцыю чавускай раённай газеты надзвычай важны факт трацкісцкай правакацыі.

У пісьме паведамлялася, што ўжо больш трох месяцаў ва ўсушскае сельпо не прывозяць хлеб і муку па віне старшыні райспажыўсаюза Ліпоўскага. На сталпыо Чавусы прыбыла некалькі вагонаў мукі, але Ліпоўскі адправіў яе назад, заяўляючы:

— У мяне няма грошай, каб выкупаць муку.

А ў гэты-ж час у крамы сельпо адгружалі гарэлку і накіроўвалі «раз'ясненні», што, моў, хлеба няма, гэта «дзяржаўная прычына».

Гэты факт яўнай трацкісцкай подпавакацыі і шкодніцтва рэдактар схаваў ад чытачоў і грамадскасці. Толькі некалькі дзён назад гэта пісьмо вынута з могілак важнейшых сігналаў раёна — стала рэдактара газеты.

Другі не менш важны сігнал рэдакцыя атрымала праз «Крестьянскую газету» з калгаса «Зара Кастрычніка» Амхініцкага сельсовета. У пісьме паведамлялася аб яўным шкодніцтве ў калгасе, дзе загінула добрая палова конскага пагалоўя, шмат дробнай жывёлы, разбазараны кармы і інш. соцыялістычная ўласнасць.

Рэдактар і гэты сігнал захаваў у стол, адкуль ён вынут толькі цяпер.

Дзесяткі і сотні такіх і падобных сігналаў знайшлі сваё сховішча ў рэдактарскім стале. Райком партыі не мог не ведаць аб гэтых справах, але маўчаў і цяпер маўчыць.

Не мог райком не ведаць і аб тым што рэдакцыя па ўказны ворагаў адшывала ад газеты лепшых, адданых справе партыі Леніна—Сталіна рабселькораў. З ліку селькораў былі выключаны калгаснікі-актывісты Емельянаў, Аксёнаў, Волкаў і інш. толькі за тое, што яны выкрывалі ворагаў у калгасах. Ім рэдактар проста забараніў пісаць у раённую газету.

Зараз гэты яўны вораг совецкага народа, польская шпіёнка із'ята з рэдакцыі. Але яе сузязі не расследуюцца. Яе прыхвасні і апекуны працягваюць зладзейскую работу.

Цэлы год працаваў з ёю ў рэдакцыі нейкі Жучанкоў. Ён быў асабіста звязан з гэтай шпіёнкай, жыў з ёю на адной кватэры. Пасля яе арышту Жучанкоў, не разлічыўшыся ў рэдакцыі, не зняўшыся з уліку ў райкоме комсамола, уцёк з раёна, пакінуўшы нават свае рэчы. Частка з іх аказалася нават апячатанай у пакоі гэтай шпіёнкі.

Добрыя дзядзі з менскага КІЖ'а толькі і чакалі яго. Ён зараз-жа быў залічан на вучобу, атрымаў інтэрнат і стыпендыю. Ніхто нават не пацікавіўся, хто ён і адкуль.

***

Асталося ў раёне і нямала прыхвасняў гэтай шпіёнкі, але іх пакуль ніхто не турбуе, бо галоўны заступнік і апякун гэтай прахвосткі астаўся ў Чавусах. Усе ў раёне ведаюць, што гэту шпіёнку прывёз з сабой сакратар РК КП(б)Б Геўрусёў. Ён працаваў з ёю яшчэ ў Ельскім раёне. Геўрусёў глушыў усе сігналы, якія паступалі ў райком аб яе шкодніцкай дзейнасці.

Раённая партканферэнцыя не выказала давер'я рэдактару газеты. Геўрусёў рашуча адстойваў яе ў спіску для закрытага (тайнага) галасавання ў члены райкома. Аднак, толькі каля 40 чалавек з больш чым 150 комуністаў раёна галасавалі за выбары яе ў склад райкома. Тады Геўрусёў настойваў, каб хоць у кандыдаты райкома яе правесці. Але комуністы зусім інакш аднеслісяда яе. Пры галасаванні ў кандыдаты райкома яна ні аднаго голасу не атрымала.

Аднак Геўрусёў і пасля гэтага працягваў трымаць яе на пасадзе рэдактара райгазеты. Да апошняга дня гэта шпіёнка была невыязным госцем у сакратара райкома. Яна часта заходзіла на «абед» «вячэру» да старога сябра, удзельнічала ва ўсіх папойках, якія даволі часта праводзіліся ў раёне і на кватэры сакратара райкома. «Гасціў» у іх абодвух і вораг народа, былы нарком аховы здароўя БССР. Бюро райкома партыі пакуль маўчыць аб паводзінах свайго сакратара. А запікавіцца было чым. Геўрусёў прывёз у Чавускі раён не толькі выкрытую шпіёнку, але і даволі вялікі хвост, прычым вельмі запэцканы.

Старшынёй райспажыўсаюза, па рэкамендацыі Геўрусёва, быў абран Ліпоўскі, той самы трацкісцкі правакатар, аб якім ішла гутарка вышэй. Ліпоўскі — сын буйнага быхаўскага гандляра, ашуканствам трапіў у партыю. Пралезшы ў чавускі райспажыўсаюз, ён прыняў на работу спекулянтаў, раней судзімых за растрату — Рахалькіна, Ліўшыца, Іофе і інш. Жуліку Смаляку, асуджанаму за абкраданне пакупнікоў і кражу тавараў, ён выдаў добрую характарыстыку, бо разам з ім пягаў са склада розныя тавары. Па няпоўных падліках, у райспажыўсаюзе за гэты год па крамах і сельпо растрачана 6.733 руб.

У сухараўскім сельпо арудуе асабісты прыяцель Ліпоўскага, падхалім і жулік Кацман А. Канферэнцыя пайнікаў сухараўскага сельпо ў сваёй пастанове так і запісала: «Контррэволюцыйныя дзеянні Кацмана А. натхняліся і пакрываліся самім Ліпоўскім». Аднак і Кацман і Ліпоўскі асталіся на сваіх месцах.

Гэты-ж Кацман са згоды Ліпоўскага закапаў у зямлю каля тоны свініны і этнаіў яе, склаўшы акт на 170 кг.

Ліпоўскі і Кацман з кааператыўнай гаспадаркі завезлі на кватэру былому старшыні РВК Гурыну два кабаны. Не адмовіўся ад падарунку сяброў і Геўрусёў, якому завезлі на кватэру адкормленага кабана каля 10 пудоў. Зусім зразумела цяпер чаму на ўсіх раённых нарадах Геўрусёў ставіць Ліпоўскага ў прыклад усім работнікам раёна:

Вучыцеся працаваць у Ліпоўскага,— паўтарае заўсёды Геўрусёў.

Партарганізацыі райспажыўсаюза Геўрусёў забараніў абмяркоўваць справу аб Ліпоўскім.

— Ён наменклатурны работнік ЦК і абмяркоўваць яго — не маеце права, — заявіў сакратар райкома парторгу.

***

Найвялікшую падазронасць выклікаюць сувязі Геўрусёва з Марозавым. Марозаў — стары сябр Геўрусёва, працаваў раней намеснікам начальніка палітаддзела Чавускай МТС. Начальнікам палітаддзела ў той час працаваў польскі шпіён, намеснікам па комсамолу быў таксама вораг народа, нядаўна выкрыты ў менскім ГК ЛКСМБ. Абодва яны былі добрымі сябрамі Марозава, разам праводзілі сваю шкодную работу і разам п'янствавалі.

Марозаў найбольш адкрыта праводзіў у раёне падрыўную правакацыйную работу. Праводзячы ў Галавенчыцах сельсовецкі актыў, Марозаў даў установу: «Граміць усё. Да заўтрашняга дня каб асталіся толькі шулы». Ён пагражаў арыштам і расстрэлам і дабіваўся выканання сваёй правакацыйнай дырэктывы.

Гэта адзін з эпізодаў абураючага парушэння рэволюцыйнай законнасці, наглай правакацыі ворагаў народа. Іншай работы Марозаў і не праводзіў.

У 1935 годзе Марозаў быў выключан з партыі і аддан пролетарскаму суду. Не без удзелу Геўрусёва яму ўдалося адзелацца толькі 1 годам прымусовых работ. Не справ'ўся ён адбыць свайго пакарання, як Геўрусёў, без ведама ўсіх членаў бюро РК КП(б)Б, аднаўляе Марозава ў радах партыі і выдае яму новы партыйны білет. Марозаў накіроўваецца ім-жа на адказную работу—загадчыкам райпутгандля. І тут ён працягвае сваю шкодніцкую работу. У крамы трапляюць жулікі, спекулянты і растратчыкі Быкаў, Чарноў, Ефрэменкава і інш. З крам тавары ідуць на рынак. На складах затаварванне і ў той-жа час недахват тавараў у крамах. Нядаўна Марозаў і Ліпоўскі аднавілі «закрытыя размеркавальнікі». Па папярэднему размеркаванню распрадалі знаёмым і спекулянтам велясіпеды.

Загадчыкам райза працуе Гаўрыкаў. Ён сядзіць, як гаўрык, у кабінеце і не хоча бачыць, як у яго пад носам, у райза, і ў калгасах, арудуюць ворагі народа. Землеўпарадчыкам райза пралез польскі шпіён, сын гарадскога галавы былога Чавускага павета, які праводзіў шкодніцкую і дыверсійную работу, а Гаўрыкаў штампаваў яго дзейнні.

Гаўрыкаў даводзіў планы пасеву да калгасаў большыя, чым ёсць зямлі ў калгасе. Напрыклад, калгас «Чырвоная паляна» атрымаў план пасеву на 16 га больш, чым усёй ворнай зямлі. Такіх калгасаў ужо выяўлена 8 па раёну, а ёсць іх значна больш. Гэта прамое шкодніцтва, накіраванае на развал калгасаў.

У выніку шкодніцкай работы ў раёне пала многа жывёлы, злучка сарвана больш чым на палову як па конематках, так і па іншай жывёле. Факты гэтыя не патрабуюць каментарыяў. Яны вельмі яскрава гаворацца за тое, што ў райза сядзяць шкоднікі. Але ўсё гэта ніколькі не турбуе ні Гаўрыкава, ні сакратара райкома Геўрусёва.

***

Прыведзеных прыкладаў дастаткова, каб пераканацца, што сувязі Геўрусёва больш чым падазроныя. Гэта падазронасць узмацняецца яшчэ больш, калі паглядзець на практычную дзейнасць самога Геўрусёва. У час прыняцця сталінскага статута сельскагаспадарчай арцелі Геўрусёў на раённым актыве даў такую ўстаноўку:

— Хоць у статуце і дапускаюцца прысядзібныя ўчасткі ад чвэрткі да поўгектара, але наша мэта (!?) пры правядзенні статута дабіцца, каб ні адзін калгаснік не меў участка больш чвэрткі гектара.

Гэту ўстаноўку ворагаў народа праводзілі ў жыццё. У выніку тысячы гектараў зямлі былі адрэзаны ад калгаснікаў і ўключаны ў агульны фонд калгасаў.

Пасля пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б) ад 2 жніўня 1937 года аб ліквідацыі вынікаў шкодніцтва і дапамозе калгаснаму сялянству БССР Геўрусёў «выправіў» ранейшую «памылку» наступным чынам:

— Хто зусім не мае прысядзібнага ўчастка, — даў дырэктыву Геўрусёў, — трэба надзяліць участкам. А ў каго ёсць хоць які-небудзь, — не даразаць.

І толькі пасля ўмяшання ЦК КП(б)Б і «Звязды» гэта «дырэктыва» была скасавана. І зараз з прысядзібнымі ўчасткамі ў раёне не ўсё ў парадку. У калгасе «Чырвоны партызан». Усушскага сельсовета, сядзібы пакінулі такімі, якія былі да ўступлення ў калгас. У выніку заможнікі маюць сядзібы 0,5 га і больш (Марозаў і іншыя), а многія калгаснікі ледзь чвэртку га налічваюць.

Геўрусёў сам праводзіў сход у арганізаваным шкоднікамі соўгасе «Паўлаўка», які ліквідаван па пастанове СНК СССР і ЦК ВКП(б) ад 2 жніўня. Сам ён прапанаваў арганізаваць замест соўгаса калгас, які і быў арганізован. І толькі паміма волі Геўрусёва гэта шкодная ідэя была адменена.

Пры праверцы партдакументаў Геўрусёў не выкрыў у Чавускім раёне ні аднаго ворага, пралезшага ў партыю. Першая праверка дакументаў была адменена. Геўрусёў атрымаў вымову і пасля гэтага было выкрыта, зноў-такі паміма яго жадання, каля 40 ворагаў і жулікаў, ашуканствам пралезшых у партыю.

Замацаванне лесу за калгасамі, згодна пастановы СНК і ЦК, ідзе вельмі марудна. Яшчэ не аддана калгасам 1.500 га лесу. Замацаванне праводзіцца фармальна, кабінетна. У акты на вечнае карыстанне зямлёй адданы калгасам лес не ўнесіцца. Больш таго, ёсць выпадкі, калі райлесгас выдаваў білеты на вырубку дроў у лясы, ужо «адданыя» калгасам.

Нельга лічыць выпадковым і тое, што ў раёне зрываецца выкананне гаспадарча-палітычных кампаній. Зусім маруцца ліквідуюцца вынікі шкодніцкай работы ворагаў народа. Тут з ворагамі народа аб'яўлена перамір'е.

Але ворагі народа не лічаць сябе ў стане міру. Яны вядуць жорсткую і адкрытую барацьбу. Трацкісцкія гады працягваюць сваю падрыўную і правакацыйную работу. Многія заклят

Ніна Боцян, Люся Рубіна і Ніна Васілюк — вучаніцы 4-га класа 28-й сярэдняй школы пасля заняткаў (Менск).

Фото Седзінкіна (БСФ).

ПАД АПЕКАЙ БЕЛГАЛОЎСПІРТА

У 15 кілометрах ад раённага цэнтра Касцюковічы знаходзіцца Забычанскі спіртзавод. На гэтым прадпрыемстве раніцай 8 жніўня адбылася падзея, устрывожыўшая ўвесь калектыў. Работніца Прудзікава Лукер'я была атручана. Яна задыхалася, з горла хлынула кроў, усё закруцілася перад вачыма жанчыны, страціўшай прытомнасць. Падругі на руках аднеслі яе дамоў. Нявопытная і не разбіраючыся ў прычынах атруты, Лукер'я карміла грудзьмі сваё двухмесячнае дзіця, якое адразу-ж захварэла і памёрла.

Калектыў Забычанскага спіртзавода адразу ўказаў і выкрыў ворага, які адважыўся падняць сваю брудную руку на жыццё работніцы. Гэта былы тэхнарук завода нейкі Іванчын. Гэта ён з тупой раўнадушнасцю паслаў чорнарабочую Прудзікаву Лукер'ю зрабіць змазку квасільнага чана густым растворам хлорнай вапны. Лукер'я не прайшла нават тэхмінімума і проста не ведала, што трэба надзець процівагаз. Два разы яна крычала Іванчыну, што задыхаецца, што ёй дыхаць няма чым, але гэты злачынца знайшоў сваю афару.

— Рабі што табе згадваюць! Я з табою не песні пець сюды прышоў!—Яраснэ крычаў ён на Прудзікаву.

Калі работніца была ўжо атручана да страты прытомнасці, гэты «тэхнарук» спакойна, быццам нічога не здарылася, пайшоў па сваіх справах.

На работу ў БССР Іванчына перацягнуў з Заходняй вобласці начальнік Белгалоўспірта Кузмічоў. Працуючы раней дырэктарам Доктаравіцкага спіртзавода, Копыльскага раёна, Іванчын раскрадаў дзяржаўную маемасць, рабіў растраты і быў выключан з партыі. Невядома якім лёсам, праз 8 месяцаў пазбаўлення волі ён быў выпушчан, і адразу-ж гэтага прайдзісвета прыгрэлі падазроныя дзядзі з Белгалоўспірта. Іванчына прызначылі тэхнарукам Забрускага спіртзавода, дзе з яго з'яўленнем заметны сталі прапажы зярна і дзе ён збіваў рабочых. Калі і там Іванчын «не ўжыўся», яго прызначылі тэхнарукам Забычанскага спіртзавода.

Тут, як нідзе, Іванчын разгарнуў сваю злачынную дзейнасць, школзіў, як толькі магчыма было. Жулік і аферыст, ён краў і прадаваў спірт на рынках. Пад выглядам нізкай платы за барду ён устроіў адводную трубу, па якой спускаў барду ў возера і гэтым нанёс страты на дзесяткі тысяч рублёў. Абнаглеўшы, у выніку моцнай падтрымкі ў Белгалоўспірце, Іванчын разам з прапаваўшым на заводзе хімікам Гарэлікам збівалі рабочых. Ён самачынна вытнаў з завода некалькі лепшых стаханаўцаў. Няма патрэбы пералічваць усе дробныя і вялікія злачынствы гэтага прайдзісвета. Дастаткова сказаць, што ніхто іншы апрача яго, вельмі майстэрска падрыхтаваў і арганізаваў пажар на заводзе (28 снежня мінулага года).

Не гледзячы на рад сігналаў, у Белгалоўспірце і ў РК КП(б)Б, дзе тады арудваў выкрыты зараз вораг народа, Іванчына лічылі «незамянімым». Пры такіх умовах не дзіўна, што маленькі завод аказаўся прыстанішчам для ўсякіх прахадзімцаў, для людзей з цёмным мінулым. Яшчэ і цяпер на заводзе працуе памочнікам тэхнарука нейкі Чмыхаў, на змене якога здарылося атручванне работніцы Прудзікавай. Пры дзіўных абставінах ён выкрупіўся ад адказнасці за пажар на Забелышынскім спіртзаводзе, дзе быў тэхнарукам. Пажар на Забычанскім заводзе таксама адбыўся ў часе яго дзяжурства. Пры абмене партдакументаў Чмыхава выключылі з партыі. У гэтага чалавека ў розных дакументах аказаліся розныя прозвішчы па бацьку. Яшчэ і цяпер працуюць рабочыя Лазауноў Фепіс і Асіпенка Фёдар, якія пасобнічалі Іванчыну ў яго злачынных махінацыях. Яны блізкія родзічы высланых контрэволюцыйных элементаў. Да нядаўняга часу на заводзе арудвалі бандыты, баптысты, антысавецкія людзі.

Рознымі спосабамі гэтая зграя ўкрывалася ад адказнасці. Напрыклад, былы загадчык гаспадаркі Мендэлеў, які прадстаўляў фіктыўныя грашовыя дакументы, закідваў рэдакцыю «Звязды» пісьмамі ўзяць яго пад абарону. Між іншым, гэты метад адвесці ад сябе падазрэнне гэты брудны чалавек атрымаў у спадчыну ад Іванчына, які таксама «сігналізаваў» у Белгалоўспірт аб розных злачынствах, якія нібыта іншымі рабіліся на заводзе. Былы дырэктар Майсеенка, пры якім на заводзе арудвалі ўсе гэтыя злачынцы, паспяшыў рэпіраваць і цяпер спакойна працуе намеснікам дырэктара Касцюковіцкага спіртзавода.

Забычанскі спіртзавод не выконвае вытворчай праграмы. Скрыта і замаскавана вораг часта дае аб сабе ведаць. За апошні час пачасціліся выпадкі, калі нечыяй варожай рукой псуецца пажарны інвентар, псуецца і знішчаецца прадукцыя.

Аб усім, што адбывалася і што здбываецца на Забычанскім спіртзаводзе, ведаюць у Белгалоўспірце і ў раённых арганізацыях, але не надаюць належнага значэння. У раёне наогул надзвычай слаба ідзе выкрыццё прытаіўшыхся падручных і пасобнікаў выкрытага ворага, пралезшага ў РК КП(б)Б. Чамусьці вяла ідзе барацьба з яўнымі ворагамі. Дастаткова ўказаць, што калі калектыў Забычанскага завода выкрыў Іванчына і аб атручанні было паведамлена пракурору Шабаліну, ён марудзіў з санкцыяй на арышт. Іванчын, як вопытны злачынца, скарыстаў «аператыўнасць» пракурора і ўцёк.

Н. ГАРНЫ.



Начальнік н-скай заставы заходняй граніцы СССР лейтэнант тав. Ульянаў у пагранічным калгасе «Прамень комуны» абучае маладых калгаснікаў Дудзіч Полю і Кулакевіч Саву стральбе з вінтоўкі.

Фото Пікман І. (БСФ).

ВОРАГ НА ШВЕЙНАЙ ФАБРЫЦЫ

Магілеўская швейная фабрыка імя Валадарскага промфінплан за 7 месяцаў выканала толькі на 96 проц. пры 16 проц. браку. Прычыны гэтага ў тым, што на фабрыцы адсутнічае ўвага да стаханаўцаў і не вядзецца масавая работа сярод рабочых.

Абстаноўка, створаная на фабрыцы дырэктарам Коганам, па сутнасці спрыяе шкодніцтву. Фабрыку з 2.000 рабочых пазбавілі сталовай. Памяшканне былой сталовай перарабілі ў інтэрнат, пусціўшы пры гэтым на вецер больш 30 тысяч руб., затрачаных на яе абсталяванне. Пабудаваную пасля гэтага сталовую, не гледзячы на затрату больш 100 тысяч рублёў, перарабілі ў цэх, а фабрыка так і асталася без сталовай. Цяпер гавораць аб новых праектах аднаўлення сталовай у інтэрнаце пасля пабудовы новага інтэрната.

Калі да гэтага дадаць частыя затрымкі выплаты заработнай платы, адсутнасць у цэхах пітнявой вады, то стане зразумелым, што чыясьці варожая рука тут дзейнічае для таго, каб выклікаць нездавальненне рабочых.

Не лепш абстаіць справа і з вытворчымі пытаннямі. Сістэматычна пускаецца ў вытворчасць матэрыял высокай каштоўнасці, а гатовая прадукцыя збываецца па прэйскурантных цэнах вырабаў з таннага матэрыялу. Цэхі прастойваюць з-за адсутнасці матэрыялу, у той час як кавалкі ад 8 да 40 метраў даўжыні лічацца астаткамі і ў вытворчасць не пускаюцца. На складах пралежваюць месяцамі дзесяткі тысяч штук гатовай сезоннай вопраткі толькі з-за адсутнасці ярлыкоў. Тэхнічныя кіраўнікі пэхаў падбіраюцца не па асабістых здольнасцях і ўменню працаваць, а ў меру іх угодлівасці Когану. У выніку гэтага многім здольным работнікам стзораны немагчымыя ўмовы работы.

Незразумела пазіцыя магілеўскага гаркома КП(б)Б, які не жадае ўмешвацца ў справы швейнай фабрыкі.

О.

100.000 РУБЛЁЎ ПРЫБЫТКУ

Калгас «Брыгадзір», Шыбецкага сельсавета, Аршанскага раёна, убраў 41 гектар селекцыйнага ільну, атрымаўшы ўраджай у 6,5 цэнтнера ільнасемя з аднаго гектара. Ураджай ільнавалакна чакаецца ў 6 цэнтнераў з гектара ў сярэднім не ніжэй 16 нумара.

У калгасе ідзе цяпер пад'ём трасты і яе апрацоўка. Дзяржаве ўжо зданы першыя 20 цэнтнераў ільнавалакна 22, 20 і 16 нумараў. Калгас атрымае прыбытак ад ільну ўсяго да 100 тыс. рублёў.

Чэсная работа на ільняных калгасных палях забяспечыла калгаснікам добрую вагу прадпляня. Па папярэдніх падліках на адзін прадпазень выйдзе 2,7 кілограма зернавых, 10 кілограм бульбы і 1 руб. 50 кап. грашыма. Старшынёй гэтага калгаса з'яўляецца ордэнаносец т. Палітыка.

ХТО ПАДРЫВАЕ КАЛГАС?

Калгас імя Пакроўскага, Озерскага сельсовета (Уздзенскага раёна), лічыцца адным з перадавых.

Але вораг Чэрнік Ю. П. усімі мерамі імкнецца падарваць магутнасць калгаса. Гэты Чэрнік — у мінулым бандыт. Пры белапольскай акупацыі выдаваў палякам чырвоных партызан.

У 1930 годзе, калі ў вёсцы арганізаваўся калгас, Чэрнік з сваёй жонкай зноў вярнуўся і пачаў халайнічаць, каб яго прынялі членам сельгасарцелі.

Яго прынялі, пабудавалі хату, далі пёлку. А зараз гэты заядлы вораг усімі мерамі падрывае калгаснае жыццё. Яго жонка не выходзіць на работу, агітуе супроць выхаду на працу калгаснікаў. Яна распускае розную хлусню, нікому не дасць на схозе сказаць слова.

Да гэтага трэба дадаць, што браты Чэрніка высланы з БССР за шкодніцкую дзейнасць.

Трэба ачысціць калгас ад ворагаў.

ЯНКА АЛЕКСАНДРОВІЧ.

КРОЎНАЯ СПРАВА ПРОФСАЮЗАЎ

(Па пісьмах у рэдакцыю)

У пісьмах, паступаючых у рэдакцыю, рабочыя торфзаводаў скардзяцца на дрэнныя бытавыя ўмовы, адсутнасць культурнай работы, безгаспадарчасць.

Тав. Гарэцкі з торфзавода «Звязда», Бабруйскага раёна, піша, што на заводзе вельмі дрэнна пастаўлена грамадскае харчаванне. У кааператыўнай краме апрача хлеба нічога няма. Тавараў шырспажыву зусім не завозяць.

У такім-жа становішчы знаходзяцца і рабочыя торфзавода «Шлях социялізма», Добрушскага раёна.

Рабочы Дзімітракоў піша, што ў інтэрнатах 3-га ўчастка вельмі брудна. Рахункавод Шэўчанка аблічвае рабочых. За звышчасовыя гадзіны зусім не аплачваюць. Многа рабочых пакінулі завод. Тарфком (старшыня Шабалін) не цікавіцца жыццём тарфянікаў.

Тав. Разумовіч з Асінторфа піша, што на ўчастках вельмі пашырана раскрадванне дзяржаўнай маемасці. У 1936 годзе было раскрадзена розных рэчаў на 20 тысяч рублёў і незаконна спісана на 250 тысяч рублёў.

На пасаду каменданта прабраліся жулікі і п'яніцы. Ніякага ўліку маемасці няма.

Кроўная справа тарфкомаў — штодзенна клапаціцца аб паляпшанні матэрыяльна-бытавога становішча рабочых, паляпшэнні справы аховы працы, вытнанні і ачыстцы тарфяных заводаў ад усіх прымазаўшыхся і класава-варожых элементаў.

ЦІ БУДЗЕ У СЛУЦКУ ЭЛЕКТРЫЧНАСЦЬ?

Звыш трох год будавалася слуцкая электрастанцыя. Не паспелі яе пусціць у эксплаатацыю, як са строю вышлі два паветранагравацелі (паветраныя эканамайзеры), якія былі няправільна сабраны. Пераробка каштавала 3.200 рублёў.

На станцыі ёсць два катлы Шухава. Адзін з іх кожны дзень усё асаджваецца. Абмуроўка катла зроблена з дрэннай цэглы і фундамент яго ледзь трымаецца. Сам каркас дрэнна заварэн і таму разрываецца па швах. Станцыя будавалася без усякага тэхнічнага нагляду.

Увесь цеплавы мантаж паступова ламаецца і патрабуе вялікага рамонту. Ёсць пагроза, што восенню горад можа астацца без святла. Па праекту станцыя павінна асвятляць апрача горада яшчэ насельніцкія пункты радыусам да 15 кілометраў. Але-ж дагэтуль нічога не зроблена, каб правесці святло да бліжэйшых пунктаў. Кацёл прыходзіцца штомесячна спыняць і чысціць. Турбіны старыя. Прапрацаваўшы тры месяцы, прышлося іх спыніць на капітальны рамонт.

Цэлы год электрастанцыя пакутвала з-за вугальных шчотак. Як толькі пройдзе дождж — у машынным зале поўна вады, спены чарнеюць ад падпёкаў. У 1936 годзе страты па станцыі складалі 200.000 рублёў, а за паўгоддзе гэтага года — 60.000.

Слуцкі горсовет і акруговыя арганізацыі ні разу не заняліся справамі станцыі, а становішча яе даволі пагражаючае.

МІХАЙЛАЎ.

РАБОТА З ХАТНІМІ ГАСПАДЫНЯМІ

БАРЫСАЎ. Больш 50 прапагандыстаў і агітатараў праводзяць работу сярод хатніх гаспадынь па растлумачэнню ім новага выбарчага закона. Пры кварткомах створаны 4 сталыя гурткі, у якіх жанчыны вывучаюць Палажэнне аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР. Асабліва жыва і актыўна праходзяць заняткі ў гуртках, якімі кіруюць прапагандысты тт. Макухін і Далінскі.

Гарадскі совет прыступіў да вызначэння выбарчых участкаў, пачынае работу па складанню спісаў выбаршчыкаў.

18 верасня ў Нова-Барысаўскім парку адбылася вялікая масоўка, прысвечаная падрыхтоўцы да выбараў у Вярхоўны Совет.

ЗАКУПКІ СТАХАНАЎКІ БУДРЫК

Марыя Іванаўна Будрык — брыгадзір свінасоўгаса імя Дзержынскага, Копыльскага раёна, адна з лепшых стаханавак свінасоўгасаў рэспублікі. Яна добра авалодала тэхнікай вытворчасці і перавыконвае заданні. Выхад парасят на адну матку складае 11 проц. Сярэдняя вага аднятых 302 парасят у двухмесячным узросце складае па 14 кілограм кожнае. Заработная плата Марыі Будрык дасягае 600—700 руб., свінарак яе брыгады да 350—400 руб.

Днямі тав. Будрык спецыяльна прыязджала ў Менск, каб зрабіць сабе пакупкі да свята 20-годдзя Кастрычніка. Яна купіла сабе добрае паліто, туфлі, галошы, трыкатажныя рэчы і рознай мануфактуры.

КАЛГАСНЫ ХОР

Два гады існуе калгасны хор у Княжыцкім сельсавеце, Магілеўскага раёна. За гэты час хор значна вырас і ўмацаваўся. У ім удзельнічае 42 маладых і пажылых калгаснікаў і калгаснік сельгасарцелей імя Дзімітрава і XVII партз'езда. 60-гадовы Баравікоў — актыўны ўдзельнік хора. Ён аўтар некалькіх жартоўных вясёлых меладычных песень.

Два разы ў тыдзень хор выступае ў Доме соцкультуры, і кожны раз клуб бывае перапоўнены.

У рэпертуары хора налічваецца ўжо да 20 народных і рэволюцыйных песень. Асабліва радасна калгаснікі слухаюць у выкананні хора песню аб Сталіне. «Ад края і да края», песню аб Варашылаве.

Цяпер хор прыступіў да актыўнай падрыхтоўкі да Кастрычніцкіх свят. У святочныя дні ён будзе выступаць на калгасных вечарах з вялікай папоўненай праграмай.

Гэты выдатны калгасны хор мае вялікія перспектывы для свайго далейшага развіцця. Яму патрэбна дапамога спецыялістаў, патрэбны музычныя інструменты. Нажаль, раённыя арганізацыі не аказваюць хору ніякай увагі і дапамогі.

ЛЕКЦЫІ НА АНТЫРЭЛІГІЙНЫЯ ТЭМЫ

У апошні час у клубах Менска праводзіцца рад лекцый на антырэлігійныя тэмы. Рабочыя-будаўнікі праслухалі ў сваім клубе лекцыі на тэмы «Фашызм і рэлігія», «Новы выбарчы закон і барацьба з рэлігіяй» і «Класавая сутнасць яўрэйскіх рэлігійных свят». У клубе імя Сталіна адбыўся антырэлігійны вечар для саматужнікаў і яўрэйскіх працоўных прадпрыемстваў, на якім прачытана лекцыя «Класавая сутнасць яўрэйскіх рэлігійных свят». У клубе Медсанпрацы арганізуецца лекцыя на тэму «Сталінская Канстытуцыя і барацьба з рэлігіяй».

МУЗЕЙ МІНЕРАЛАЎ

Калі адчыняеш дзверы, адразу кідаюцца ў вочы невялікія сталы ў доўгім пакойчыку, на якіх ляжаць розныя кавалачкі каменяў.

Камні — гэтыя нежывыя сведкі гісторыі зямлі — сабраны і прывезены сюды з усіх канцоў нашага Вялікага Саюза. Тут ёсць у калекцыі і мінералы з усіх мацерыкоў зямлі — ад халоднай поўначы да гарачай Аўстраліі.

Сонца кідае праз важно яркія праменні і ад іх зіхацяць рознастайнымі колерамі— мангольскі палявы шпат, светларужовы дарагі адшліфаваны кавалак агата, зялёныя малахіты Урала, серабрысты кварцавы пясок Беларусі і бліскучы кавалак рэдкага афрыканскага алмаза — усё ўзоры шматлікіх мінералаў з розных куткоў зямнога шара.

Багацце мінералаў Совецкага Саюза прадстаўлена народамі Туя-Муніцкага рудніка, пяскамі Каракума і рознымі іншымі экспанатамі. Студэнты Беларускага дзяржаўнага універсітэта вывучаюць калекцыю свайго музея і ганарацца такой скарбніцай розных камняў. Ды і не дзіва — 2 з паловай тысячы музейнага тыпу і каля 2-х тысяч вучэбных мінералаў змяшчаюцца ў гэтым памяшканні. Калі перавесці іх на грошы, то сума перавысіла-б больш 40 тысяч рублёў.

Студэнты сядзяць над калекцыямі і вывучаюць іх. Яны бяруць кавалкі мрамара і спрабуюць чарціць па ім бліскучай важкай свінцовай рудой. Па цвёрдасці, па афарбоўцы рыскі на мрамары, па своеасаблівасці паху яны напамінаюць якасці мінерала.

Сюды прыходзяць паглядзець багацце мінералаў байцы Чырвонай Арміі, калгаснікі з бліжэйшых калгасаў і студэнты іншых інстытутаў Менска. Яны аглядаюць маленькія кавалачкі рознакаляровых камняў і ўважліва слухаюць тлумачэнне навуковага працаўніка музея тав. Зубрыцкага. Ён расказвае экскурсантам пра багацці нашай зямлі, якая раскрыла свае нетры чалавеку.

П. ЛЕВАНОВІЧ.

ЧЫМ ЗАЙМАЮЦЦА СОВЕТЫ ВЫНАХОДЦАЎ?

Стаханаўскі рух высунуў з асяроддзя рабочых новыя тысячы таленавітых рацыяналізатараў і вынаходнікаў. Толькі за апошні год наша тэхніка ўзбагацілася дзесяткамі буйнейшых вынаходніцтваў, умацоўваючых социялістычную магутнасць Совецкага Саюза.

Новы ўздым вынаходніцтва, выкліканы вялікім стаханаўскім рухам, асабліва востра паставіў пытанне аб хуткім выкарыстанні рацыяналізатарскіх і вынаходніцкіх прапаноў для павышэння прадукцыйнасці працы. Асаблівае значэнне ў гэтым святле набывае хуткае эксперыментаванне, праверка і ўкараненне прапануемых вынаходніцтваў і тэхнічных удасканаленняў.

Адказнасць за практычнае ўкараненне каштоўных прапаноў ускладзена на наркаматы. Але яны не выконваюць рашэння ўрада.

У Наркаммясцпроме не скарыстоўваюцца нават адпушчаныя сродкі на гэтую справу. У Наркомлесе і Наркамлегпроме здзівіліся, калі ў іх спыталі аб рацыяналізацыі. Хіба яны павінны займацца такімі рэчамі?

Такія наплявацельскія, абыякавыя адносіны да важнейшай справы — вынаходніцтва—з боку наркаматаў паслужылі зручнай лазейкай для ворагаў, якія прабраліся на гэты ўчастак і затрымлівалі разгляд і ажыццяўленне каштоўных вынаходніцтваў.

На гомельскім шклозаводзе імя Сталіна некалькі год марынуецца буйнейшае вынаходніцтва інжынера Каралёва. Прапанованае ім вынаходніцтва — канвеер для выцягвання шкла—мае буйнейшае значэнне для ўсёй шклопрамысловасці Саюза; яно дасць мільёны рублёў эканоміі.

Гэты-ж таленавіты інжынер вынайшоў спецыяльную лодачку для выцягвання тоўстага і фоташкла. Тоўстае шкло мае выключна важнае значэнне ў народнай гаспадарцы. Праведзеныя вопыты па атрыманню гэтых сартоў шкла далі добрыя рэзультаты. Завод ужо атрымаў дзесяткі заказаў.

Але кіраўнікі прадпрыемства свядома ігнаравалі ўкараненне прапаноў тав. Каралёва і стараюцца ўсякімі спосабамі адвязацца ад дакучлівага вынаходцы.

На гэтым-жа заводзе марынуюцца і дзесяткі іншых каштоўных прапаноў вынаходнікаў—Феакістава, Дзятлева, Пінягіна і інш.

Галоўны механік завода Спірыдонаў, пад відам розных аб'ектыўных прычын, свядома затрымлівае прасоўванне і ўкараненне ў вытворчасць рацыяналізатарскіх прапаноў.

Прывядзем некалькі характэрных лічб. У 1936 годзе са 102 прынятых прапаноў ажыццёўлены толькі 23. Між іншым толькі 11 ажыццёўленых прапаноў далі 159.950 рублёў эканоміі.

Такія-ж злачынныя з'явы маюць месца і на іншых буйнейшых прадпрыемствах рэспублікі.

На магілеўскім аўтарэмзаводзе імя Кірава ўчоту прапаноў у цэхах няма. Справу вынаходніцтва ўзяў у свае рукі галоўны інжынер завода Марозаў. Ён затрымлівае прасоўванне рацыяналізатарскіх прапаноў, стварае штучныя «стадыі» распрацоўкі іх у тэхнічным аддзеле.

Некаторыя прапановы, якія зусім не патрабуюць спецыяльнай тэхнічнай распрацоўкі, ён усё-ж пасылае ў тэхнічную частку, дзе яны ляжаць месяцамі. Да прыкладу, прапанова тав. Недвіцкага не патрабавала канструктыўнай распрацоўкі, а варта было толькі даць заказ у цэх — і яна магла быць адразу рэалізавана. Аднак Марозаў сумысля, каб затрымаць прапанову, здае яе ў тэхаддзел, дзе яна ляжыць некалькі месяцаў.

Адказны на заводзе па рацыяналізацыі Панамароў займаецца жульніцтвам і ашуканствам. Прапанова т. Недвіцкага (якая паступіла 15 красавіка) «разгледжана» па запісу 8 красавіка, г. зн. за 7 дзён да таго, як яна была ўнесена рацыяналізатарам. Такія-ж факты мелі месца і з прапановамі Чарнавусава, Дуракова і інш.

Па віне Марозава марынуецца прапанова т. Багданава, якая павінна даць 18.000 руб. эканоміі.

Нямала тут ёсць фактаў, калі вынаходніцтвы, прызнаныя карыснымі і нават рэалізаваныя на вытворчасці, зусім не аплочваюцца, або выдаецца за іх зусім мізэрная сума. У той-жа час фонд вынаходніцтваў у 57 000 рублёў не скарыстоўваецца.

Панамароў здзекуецца з стаханаўцаў і вынаходцаў. Калі рацыяналізатар Вяжэвіч унёс яму прапанову, Панамароў яму адказаў: «Усёроўка яна будзе ляжаць пэлы год».

Такія з'явы можна характарызаваць толькі як дзеянні класавага ворага. І нелагма за апошні час на гэтым заводзе зусім спынілася паступленне прапаноў.

Бясчынныя справы творацца на менскай фабрыцы «Комунарка». Унесеныя прапановы рацыяналізатараў ляжаць па году і больш без руху. Яшчэ ў студзені 1936 года тав. Янушкевіч унёс прапанову зрабіць станок для рамонту ражучых ланцугоў для лінейных агрэгатаў. Гэта зэканоміць штомесяц 700 рублёў і прадухіліць прастоі. Прайшло 8 месяцаў як станок зроблен, але з-за адсутнасці адной дэталі (грабёнкі) ён не можа быць пушчан у эксплаатацыю.

Другая каштоўная прапанова гэтага вынаходніка — аб перавозе трансмісіі ў дражыровачных катлах на кулачныя счапленні для эканоміі дэфіцытных пасаў (усяго ёсць 33 такія катлы, на якіх выдаткоўваецца 165 метраў пасаў) прынята, але не выканана. Аддзел снабжэння ніяк не можа дастаць валікі.

Прапанову тав. Гольдзіна аб павелічэнні хуткасці абаротаў завёртачных машынак зусім згубілі. Прапановы Асташынскага, Шаблоўскага, Індзека, Чартка і раду іншых па тры гады не рэалізуюцца.

Хіба не ведаюць аб гэтых злачынных справах дырэктар фабрыкі Пузанаў, сакратар парткома тав. Рабкін, старшыня фабкома тав. Новікаў? Зусім не выпадкова на гэтай фабрыцы стаханаўцам тармозяць у рабоце, не даюць ім магчымасці выконваць свае нормы.

Партыя вучыць нас быць чулымі да голасу кожнага працоўнага. Гэта значыць, што і ўсякае новае каштоўнае пачынанне трэба падтрымліваць. Нават дробныя рацыяналізатарскія прапановы, якія прыносяць хоць маленькую эканомію социялістычнай вытворчасці, павінны быць ажыццёўлены. Тым больш быстра трэба ўкараняць буйныя вынаходніцтвы, многія з якіх вядуць да тэхнічнага перавароту ў сваёй галіне.

Гэтай простай, ісціны не хочуць зразумець кіраўнікі фабрыкі «Комунарка».

Для таго, каб выклікаць незадаволенне сярод рацыяналізатараў і вынаходнікаў, ворагі народа, засеўшыя ў таварыствах вынаходнікаў, пад відам «тэхнічнай нямэтазгоднасці» пачкамі адхілялі каштоўныя прапановы стаханаўцаў.

На заводзе імя Варашылава з агульнага ліку паступіўшых прапаноў у 1936 годзе, а таксама і ў гэтым годзе, 50 процантаў адхілена.

Вядомы стаханавец-майстар тав. Харнас унёс нямала рацыяналізатарскіх прапаноў, якія павысілі прадукцыйнасць працы і далі вялікую эканомію. Але яму часам вельмі цяжка прасунуць сваю прапанову. Вось ужо два гады, як ён прапанаваў удасканаліць наждачны камень, але дагэтуль прапанова ляжыць без руху.

Прапанова тав. Чэрчэса аб замене алюмінёвых шківоў чыгуннымі канструктарскім бюро чамусьці адхілена.

Прыведзеныя факты маюць месца і на многіх іншых фабрыках і заводах (Бабруйскі лесакамбінат, Добрушская папяровая фабрыка, шаўковая фабрыка і інш.).

Таварыствы вынаходнікаў, закліканыя да арганізацыі масавай тэхнічнай творчасці, вырошчвання і выхавання кадраў вынаходнікаў, не аказаліся на вышыні задач, пастаўленых перад імі партыяй.

Рэспубліканскі Цэнтральны совет вынаходнікаў з'яўляецца ўзорам злачыннай бяздзейнасці. Сотні, тысячы рублёў, вызначаных дзяржаўных грошай на развіццё вынаходніцтва, выдаткоўваюцца на ўтрыманне апарата. Совет ператварыўся ў бюракратычную арганізацыю, адарваную ад вынаходніцкіх мас.

Доўгі час Совет вынаходнікаў узначальваў вораг народа, які яшчэ зараз не выведзен са складу прэзідыума. Узамен яго быў каптован тав. Готфрыд, які ўмудраўся атрымліваць за сваю «пасаду» 500 рублёў у месяц і ні разу не прыспі на пасяджэнне прэзідыума.

Былы намеснік, а цяперашні старшыня совета тав. Глозман, культывуе ў таварыстве падхалімства і сямейнасць. Совет вынаходнікаў ніякай дапамогі не аказвае нізавым заводскім арганізацыям. Тут толькі абмяжоўваюцца абследваннямі. Вялікія рэвізійныя акты «бяззубыя» і апалітычныя.

У вывадах камісій, якія абследвалі стан вынаходніцтва на шклозаводзе імя Сталіна, аўтарэмзаводзе, Бабруйскім лесакамбінаце і інш., усе злачынныя справы кваліфікаваліся інструктарамі, як «коснасць, бюракратызм і няўважлівыя адносіны да вынаходнікаў». Гэтыя апалітычныя дакументы ў сапраўднасці прыкрываюць дзеянні класавых ворагаў.

За ўвесь час Совет вынаходнікаў не змог абараніць ні аднаго вынаходніка ад здзекаў, якім ён падвяргаўся; ён не мог дабіцца правядзення ў жыццё хоць-бы аднаго каштоўнага вынаходніцтва.

На пасяджэннях прэзідыума Совета гаворыцца нямала парадных прамоў аб важнасці вынаходніцтва і рацыяналізацыі, але чаго варта гэта пустая балбатня, калі тут нават не маглі як след наладзіць тэхнічнай кансультацыі і вучобы!

Часамі Советам узнімаліся на шчыт 2—3 вынаходнікі, а з асноўнай масай не працавалі.

Чатыры гады працуе тав. Глозман у Совеце вынаходнікаў, але за гэты час ён мала чаго даў таварыству. Глозман тэхнічна няграматны, не разбіраецца ў звычайных тэхнічных пытаннях. На ўсе паступаючыя матэрыялы і прапановы ён піша рэзалюцыі свайму інструктару: «Разбярыцеся, высветліце» і т. д.

У Совеце знайшлі сабе цёплы прытулак людзі, якія нічога агульнага не маюць з вынаходніцтвам. Членам Совета доўгі час з'яўляўся Комар, які не ўнушае палітычнага давер'я. Ён заўсёды стараўся браць шэфства над абароннымі прапановамі, а Глозман садзейнічаў яму.

Заўзятым падхалімам Глозмана з'яўляецца Рудзін — загадчык гомельскага тэхкабінета. Па ініцыятыве Глозмана Рудзіну даручаецца распрацоўка тэмніка для вынаходнікаў.

Праз некаторы час на свет з'явілася «універсальная аб'ёмістая прапа» на 80 старонках. У гэтым «творы» Рудзін прапануе вынаходцам такія тэмы, — як «Знайдзіце на заводзе месца, дзе перавыдаткоўваюцца электраэнергія, вада і іншыя віды энергіі». У такім стылі напісаны і ўсе іншыя 500 тэм.

Не гледзячы на пверджанні некаторых членаў прэзідыума, што гэты тэмнік нікуды не варты, Глозман усё-ж дабіваецца яго выпуску. Вось на што траціцца час і грошы.

Значкі «Ганароваму вынаходніку» выданы людзям, якія нічога агульнага не маюць з вынаходніцтвам: Гібкіну, Рудзіну, Комару. Сам Глозман таксама атрымаў значок невядома за якія заслугі.

Характэрна, што да гэтага часу Глозман не склікаў актыва згодна рашэння Лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б).

Пры справаздачах і выбарах у Советы вынаходнікаў, што зараз праходзяць у БССР, стаханаўцы-рацыяналізатары выкрыюць ворагаў народа, якія запісаліся ў советы таварыства; намецяць практычныя мерапрыемствы па ліквідацыі вынікаў шкодніцтва, вызваляцца ад людзей, не маючых нічога агульнага з вынаходніцтвам, высунуць новыя кадры, здольныя рушыць наперад тэхнічную творчасць мас, накіраваную на ўзмацненне магутнасці нашай краіны.

І. ТУРЭЦКІ.

НА ПЛЕНУМЕ ЛІГІ НАЦЫЙ

ІСПАНСКАЕ ПЫТАННЕ Ў ЛІЗЕ НАЦЫЙ

ЖЭНЕВА (горад у Швейцарыі), 20 верасня. (БЕЛТА). Сёння пленум Лігі нацый меў магчымасць даказаць, наколькі прынцыпы «неўмяшання» і «нейтральнасці», прапаведваемыя некаторымі віднымі членамі Лігі нацый на працягу апошніх паўтара года, паспелі адваяваць уплыў у другога прынцыпа, на якім грунтуецца пакт Лігі нацый,—прынцыпа калектыўнай бяспасанасці.

У той момант, калі Іспанія, адзін з найбольш лаяльных членаў Лігі, змагаецца за сваё жыццё, як незалежная дзяржава, з заклятымі ворагамі Лігі нацый і ўсеагульнага міру—Германіяй і Італіяй, у большасці ўрадаў, паслаўшых дэлегацыі на гэты пленум, нехапіла мужнасці галасаваць за права Іспаніі быць перавыбранай у Совет Лігі нацый, у якім яна з 1928 г. займала так называемае «поўнастаяннае» месца (падлягаючае аднаўленню кожныя тры гады).

Супроць кандыдатуры Іспаніі ўсе апошнія дні, прама ці ўскосна, выступалі розныя дзяржавы. Сюды ў першую чаргу адносяцца паўднёва-амерыканскія краіны ваеннай дыктатуры, у прыватнасці, той групоўкі, якая маскіравала сваё спачуванне фашысцкім мяцежнікам «непакоем» за лёс мяцежнікаў, якія ўкрыліся ў іх пасольствах у Іспаніі, і патрабавала ад рэспубліканскага ўрада прызнання праславутага «права прытулку». Яшчэ толькі ўчора за подпісамі дэлегатаў Чылі, Балівіі, Перу, Эквадора і Кубы (краін Паўднёвай Амерыкі) іспанская дэлегацыя атрымала пісьмо, у якім высоўвалася наступная здзелка: галасы гэтых дэлегацый за кандыдатуру Іспаніі прапанаваліся ў абмен на прызнанне права прытулку, на прызнанне права запікаўленага пасла дазволіць ці не дазволіць прыцягненне да крымінальнай адказнасці перад рэспубліканскім судом укрыўшыхся ў пасла асоб (нават злачынцаў) і т. д. Першы дэлегат Іспаніі—прэм'ер Негрын—у сваім адказе напомніў аб многіх уступках, ужо зробленых іспанскім урадам у гэтым пытанні, і, выказаўшы пажаданне прадоўжыць перагаворы па гэтаму пытанню, адхіліў недапушчальныя пасягання на суверэнітэт іспанскага ўрада і незалежнасць іспанскага суда.

Далей трэба сказаць аб пазіцыі Турцыі. Турцыя таксама да гэтага часу займала поўнастаяннае месца ў Совеце, але яна на канферэнцыі бліжнеўсходніх дзяржаў уступіла гэтае месца Ірану. Высоўваючы, тым не менш, сваю кандыдатуру ў Совет Лігі, яна фактычна адбірала галасы ў Іспаніі.

Апрача гэтых дзяржаў, былі і іншыя, якія ў звязку з доўгай бяздзейнасцю Лігі нацый у адносінах аднаго са сваіх членаў, які падвяргаецца адкрытаму нападу з боку лютых ворагаў Лігі, проста трусяць, лічачы, што «без Іспаніі ў Совеце будзе спакайней».

Па пытанню аб кандыдатуры Іспаніі ў Совет Лігі нацый галасавалі 52 дзяржавы. З іх пяць апусцілі пустыя бланкі. З астаўшыхся 47 галасоў патрабавалася 32 галасы, каб скласці большасць у дзве трэці на карысць Іспаніі. Іспанія-ж атрымала толькі 23. У кулуарах Лігі заяўляюць, што незыбранне Іспаніі ў Совет не мае практычнага значэння, бо яна па статуту мае права прымаць удзел пры абмеркаванні Советам усякага пытання, датычнага Іспаніі.

Пасля кандыдатуры Іспаніі таксама была адведзена і кандыдатура Турцыі. Яна атрымала з 50 галасаваўшых толькі 25 галасоў, замест патрабуемых 34. Ворагі Лігі, вядома, не супакоіліся на гэтым. Ужо ёсць весткі, што на выбарах у Совет, на вызваліўшаяся месца раптам выстаўляе сваю кандыдатуру пасля Бельгіі і Галандыі таксама і Грэцыя.

Роля грэчаскай дэлегацыі, у сувязі з яе спробамі ўзняць пытанне аб Абісініі ў мандатнай камісіі, а таксама затрымаць ці аслабіць рашэнні ніёнскай канферэнцыі, дастаткова добра вядома ў Жэневе, каб ні ў каго не пакідаць сумненняў адносна сэнсу апошняга выступлення Грэцыі.

ВЫСТУПЛЕННЕ ІДЭНА

ЖЭНЕВА, 20 верасня, (БЕЛТА). Пасля рашэння па пытанню аб кандыдатурах у Совет Лігі нацый слова ўзяў міністр замежных спраў Англіі Ідэн.

Адзначыўшы, што пленум сабраўся ў «момант глыбокага інтэрнацыянальнага непакою» і што «ў двух частках свету вайна вядзецца не менш жорстка, чым калі-небудзь у гісторыі», Ідэн падрабязна спыніўся на вымушаных гэтай абстаноўкай велізарных узбраеннях Англіі, падкрэсліўшы пры гэтым, што нават самыя міралюбівыя краіны трацяць на ўзбраенні велізарную частку сваіх нацыянальных багаццяў.

— Англійскі ўрад, — заявіў далей Ідэн, — заўсёды лічыў, што аслабленне існуючай сістэмы міжнароднага парадку не магло быць выгадным ні для адной нацыі. Праўда, прайшоўшая ці праходзячая вайна ў розных частках свету прывяла да тэрытарыяльных заваяванняў адной нацыі за кошт другой. Але яна таксама прывяла да абяднення зыйгрышнага вайну, амаль у такой-жа меры, як і пераможанага.

— Англійскі ўрад, — сказаў Ідэн, — лічыць, што няма такіх спрэчак паміж нацыямі, якія нельга вырашыць мірным шляхам. Аднак, паколькі справа ідзе аб калектыўных дзеяннях, англійскі ўрад вымушан лічыцца з рамкамі, у якіх можна разлічваць на супрацоўніцтва тых дзяржаў, будзь яны членамі ці нячленамі Лігі, дапамога якіх неабходна.

Перайшоўшы затым да пытання аб Іспаніі, Ідэн абараняў палітыку неўмяшання, як адыграўшую галоўную ролю ў прадухіленні еўрапейскага канфлікта. Аднак, было-б нямэтазгодна адмаўляць факты вялікіх парушэнняў пагаднення аб неўмяшанні. Абазвязацельствы, узятыя на сябе дзяржавамі, не выконваліся. На іспанскай тэрыторыі ёсць вялікая колькасць салдат іншаземных нацыянальнасцей. Не дасягнута ніякага пагаднення аб іх вывадзе. Гэта станозішча рэчаў поўна небяспекі для міру ў Еўропе.

— Калі мы адмовімся ад палітыкі неўмяшання, — заявіў Ідэн, — Еўропа будзе ўцягнута ў больш небяспечныя падзеі. Аднак, які-б ні быў лёс палітыкі неўмяшання, я даю недвусэнсавае абяцанне пленуму Лігі, што англійскі ўрад не пашкадуе ніякіх намаганняў, каб перашкодзіць вайне авалодаць Еўропай.

Ідэн выказаў жаль, што не ўсе запрошаныя дзяржавы прынялі ўдзел у ніёнскай канферэнцыі, але падкрэсліў, што пытанне патрабавала «тэрміновага вырашэння» і што было-б зусім немагчымым выпрацаваць план барацьбы з пірацтвам, ведучы перагаворы з краінай, непрадстаўленай на канферэнцыі. Неабходнымі ўмовамі былі хуткасць і дзейснасць, — сказаў Ідэн, і ніёнскія рашэнні зараз праводзяцца ў жыццё.

Каротка закрануўшы становішча на Далёкім Усходзе, Ідэн не даў ніякага ўказання аб адносінах англійскага ўрада да звароту Кітая ў Лігу нацый.

НА ФРАНТАХ ІСПАНІІ. На здымку: генеральны сакратар Цэнтральнага Камітэта комуністычнай партыі Іспаніі т. Хозэ Дыяс на фартыфікацыйных работах.
Фото Р. Кармен (СФ).

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

ПАЎНОЧНЫ ФРОНТ

Вечарам, 19 верасня, мяцежнікі праніклі ва ўсходні сектар фронта з боку Онторыа і прасунуліся да ўзвышша Бенсуа. 20 верасня мяцежнікі павялі атаку на Піедрас Бланкас, але былі адбіты, панёсшы пяжкія страты.

У часе паветранага бою ў раёне Хіхона рэспубліканскія самалёты збілі адзін фашысцкі двухматорны самалёт, які ўпаў у мора. Думаюць, што другі самалёт мяцежнікаў таксама быў збіт. Рэспубліканцы страцілі адзін самалёт.

ПАЎДНЁВЫ ФРОНТ

Рэспубліканскія войскі ў сектары Пасабланка (на поўнач ад Кардовы) прасунуліся на 12 кілометраў, не гледзячы на ўпартае супраціўленне мяцежнікаў.

У рэзультаце аперацый, прадпрынятых рэспубліканскімі войскамі, апошнія панаюць над чыгункай, якая вядзе да Пеньяройя. На правым флангу рэспубліканскія войскі занялі першыя дамы Гранха дэ Торэермоса (правінцыя Бадахос). У часе атакі быў знішчан батальён мяцежнікаў.

У сектары Вальсекільо рэспубліканскія войскі 20 верасня занялі апошнія ўмацаванні мяцежнікаў у Сіера Тэхонера і захапілі шмат кулямётаў, вінтовак і боепрыпасаў.

У раёне Сіма, з прычыны яраснага артылерыйскага агню мяцежнікаў, рэспубліканскія войскі вымушаны былі адыйсці. У часе прадпрынятай рэспубліканцамі контратакі іх артылерыя знішчыла батальён мяцежнікаў.

***

Тры фашысцкія самалёты скінулі бомбы над горадам Масн'ю (Каталонія, на поўнач ад Барселоны). Забіта 5 чалавек, ранена 35. (БЕЛТА).

НЯЎДАЛАЯ СПРОБА ЗАХОПУ ІСПАНСКАЙ ПАДВОДНАЙ ЛОДКІ

ПАРЫЖ, 19 верасня. (БЕЛТА). Як паведамляе агенцтва Гавас, у ноч на 19 верасня група іспанскіх мяцежнікаў у штатскім адзенні (12 чалавек) на чале з былым камандзірам рамантуючайся ў парту Леверлон (Францыя) іспанскай рэспубліканскай падводнай лодкі «С-4» здрадніка Лас Эрас імкнулася захапіць іспанскую рэспубліканскую падводную лодку «С-2», якая рамантуецца ў Брэсце (Францыя). Французскі паставы даў сігнал трывогі. Адзін з матросаў падводнай лодкі «С-2» выстраліў у аднаго з нападаўшых і забіў яго. Пасля гэтага налётчыкі, захапіўшы камандзіра падводнай лодкі «С-2» Ферандо і афіцэра-механіка, уцякалі і імкнуліся на аўтамабілі перабрацца на тэрыторыю, занятую мяцежнікамі, але недалёка ад Бардо (на поўдні Францыі) былі затрыманы.

***

ПАРЫЖ, 20 верасня. (БЕЛТА). Налёт іспанскіх фашыстаў на ўрадавую іспанскую падводную лодку «С-2», стаяўшую у Брэсцкім парту, усхваляваў грамадскую думку.

Паводле слоў газет, арыштаваныя іспанскія фашысты, удзельнікі нападу на падводную лодку «С-2», звязаны са справай аб апошніх узрывах у Парыжы.

НАГЛЫ ДЭМАРШ ГЕРМАНСКАГА ПАСОЛЬСТВА Ў БЕРНЕ

ВЕНА, 21 верасня. (БЕЛТА). Швейцарскае агенцтва апублікавала паведамленне швейцарскага ўрада аб новым наглым дэмаршы германскай дыпламатычнай місіі ў Берне (сталіцы Швейцарыі). Спасылаючыся на паведамленне жэнеўскай газеты «Журналь дэ насіон», аб банкеце журналістаў, пралстаўленых пры Лізе нацый, германская місія зварачае ўвагу швейцарскага ўрада на «зневажальныя выражэнні», нібыта зробленыя па адрасу Гітлера іспанскім прэм'ерам Негрынам у прамове на гэтым банкеце.

Швейцарскі ўрад канстатуе, што супроць Негрына ў Швейцарыі нельга прыняць ніякіх мер, бо ён карыстаецца ўсімі прывілеямі імунітэта (недатыкальнасці). Далей ён указвае, што Негрын, злаеці не дапусціў ніякіх зневажальных выражэнняў. Аднак, швейцарскі ўрад заяўляе, што ён пачаў «расследаванне».

Орган швейцарскай компартыі «Фрэйхейт» характарызуе германскі дэмарш як «наглае ўмяшанне ў справы Лігі нацый і як спробу Германіі абмежаваць існуючую ў Швейцарыі свабоду друку. Швейцарскі народ, піша газета, патрэбуе ад урада даць рэзкі адпор усякаму ўмяшанню фашыстаў.

ПАСЛЯ НІЁНСКАГА ПАГАДНЕННЯ

ПАРЫЖ, 20 верасня. (БЕЛТА). Пачынаючы з сёнешняга дня, у Міжземным моры павінен уступіць у дзеянне кантроль, устаноўлены ніёнскім пагадненнем. Газета «Пары суар» указвае, што ўвогуле гэты кантроль будзе ажыццяўляцца 150 суднамі прыблізна, 100 гідрасамалётамі.

Часова штаб брытанскага і французскага флотаў, якія будуць ажыццяўляць гэты кантроль, змяшчаецца ў Оране (Алжыр).

ПАХАВАННЕ МАСАРЫКА

ПРАГА, 21 верасня. (БЕЛТА). Сёння ў Празе адбыліся провады цела першага прэзідэнта Чэхаславацкай рэспублікі Масарыка для пахавання ў замку Ланы. За труной, устаноўленай на лафете, ішлі прэзідэнт рэспублікі Бенеш, члены ўрада парламента і дэлегацыі СССР, Францыі, Англіі, Румыніі, Польшчы, Югаславіі і іншых дзяржаў. У працэсіі прымалі ўдзел байсковыя часці гарнізона Прагі і прыбыўшыя з розных канцоў рэспублікі дэлегацыі ўсіх часцей чэхаславацкай арміі. На вуліцах Прагі пахавальную працэсію суправаджалі звыш мільёна чалавек. Затым труна з целам Масарыка была перанесена ў вагон і адпраўлена ў замак Ланы, дзе і адбылося пахаванне.

ЗАМЕЖНЫ ГАНДАЛЬ СССР

Паводле даных Галоўнага таможанага кіраўніцтва Наркамата замежнага гандля СССР, агульны замежнагандлёвы абарот Совецкага Саюза за студзень—жнівень 1937 года склаў 1.929,2 мільёнаў руб. — на 163,7 млн. рублёў больш, чым за тыя-ж месяцы мінулага года. Экспартавана (вывезена) тавараў на 1.016,6 мільёнаў рублёў, імпартавана (увезена)— на 912,6 мільёнаў рублёў (уключаючы пастаўкі ў кошт крэдытных пагадненняў і плацяжоў па КВЖД).

У студзені—жніўні бягучага года ў параўнанні з тым-жа перыядам 1936 года, у прыватнасці, павялічыўся экспарт бавоўны на 41,2 млн. рублёў, лесаматэрыялаў — на 28,1 млн. рублёў, аўтатранспарту — на 15,9 млн. рублёў, марганцавай руды — на 15,3 млн. рублёў, угнаенняў — на 8,5 млн. рублёў, машын —на 8,4 млн. рублёў, пушнины — на 6,8 млн. рублёў, электрамашын і прыладаў да іх — на 1,3 млн. руб.

За той-жа час павялічыўся (у параўнанні з мінулым годам) імпарт каляровых металаў, авечай воўны і каўчука. Зменшыўся імпарт машын на 55,4 млн. руб., чорных металаў — на 22,5 млн. руб., пушнины — на 11,7 млн. руб., электрамашын і прыладаў да іх — на 9,9 млн. руб., суднаў — на 8,9 млн. руб., вырабаў з чорных металаў вытворчага назначэння — на 4,9 млн. руб., прадметаў дакладнай механікі — на 4,5 млн. руб., хімічных прадуктаў — на 4,3 млн. руб.

У агульным экспарце СССР за студзень—жнівень 1937 года сельскагаспадарчыя тавары склалі 25,3 проц., а прамысловыя — 74,7 проц. З агульнага імпарту СССР 92,7 проц. складаюць тавары вытворчага назначэння і 7,3 проц. — тавары спажывецкага назначэння.

Па размерах гандлёзага абароту СССР з асобнымі краінамі ў студзені—жніўні 1937 года першае месца займае Вялікабрытанія, другое — ЗША. («ПРАВДА»)

ЗАСЛУЖАНЫ АДПАЧЫНАК

Каманда лепшых стаханоўцаў менскай швейнай фабрыкі «Кастрычнік», зрабіўшая выдатны пераход у працівагазах і пропіітрытных касцюмах па маршруту Менск—Кіеў, атрымала заслужаны адпачынак.

Удзельнікі пераходу і абслугоўваючы персанал днямі выязджаюць на курорт у Сочы.

ГАНДАЛЬ ГАЗАЙ У МЕНСКУ

Перабоі ў гандлі газай, якія назіраліся за апошнія дні ў Менску ў сувязі з кенармальным завозам, ліквідуюцца, як паведамілі нашаму супрацоўніку ў Наркомунутгандлі, газа штодзенна паступае ў гандлёвую сетку ў дастатковай колькасці.

Для лепшага абслугоўвання спажыўцоў, гандлёвая сетка па гораду пашырана. Адкрыта дадаткова 15 пунктаў па продажу газы ў розных частках горада, у прыватнасці на Грушаўскім пасёлку, у Тучынцы, у пасёлку «Камінтэрн», на Комсамольскай, Совецкай і інш. вуліцах. Час гандлю газай часова працягнут з 7 гадзін раніцы да 8 гадзін вечара.

ПАПРАЎКА

УЧОТНА-СТАТЫСТЫЧНАГА АДДЗЕЛА НАРКАМЗЕМА БССР

Па віне работніка ўчотна-статыстычнага аддзела Наркамзема БССР т. Кіршэўскай В. І. і кіраўніка групы Канцэвіка П. О. у апублікаванай у газетах 20 верасня зводцы сельгасработ па становішчу на 15 верасня дапушчана памылка. Замест графы «Скошана сена другога ўкосу» трэба чытаць: «Скошана калгасамі сеяных траў другога ўкосу».

Нач. учотна-статыстычнага аддзела ІВАШЧЭНКА.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

22 верасня г. г., у 7 гадзін вечара, у памяшканні клуба электрастанцыі склікаецца нарада сакратароў парткомаў і парторгаў Варашылаўскага раёна. Яўка абавязкова.

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

БЕЛДЗЯРЖДРАМТЭАТР 22 верасня
Абанем. № 10
ПЛАТОН КРЭЧЭТ
Пачатак у 8 г. вечара.

Гукавы кінотэатр «Чырвоная зорка»
ПЁТР ПЕРШЫ
На летняй эстрадзе — канцэрты. адз.

Дзіцячы гукавы кінотэатр
ГАЎРОШ

Гукавы кінотэатр «Пролетарый»
«УЩЕЛЬЕ АЛАМАСОВ»

Гукавы кінотэатр «Інтэрнацыянал»
КАДЖЭШ

Гукавы кінотэатр «Спартак»
ад 22 верасня
выдатны гукавы мастацкі фільм
ДЭПУТАТ БАЛТЫКІ

У кніжныя магазіны і кіёскі «КОГИЗ'а»
Паступіла ў продаж
ПРАГРАМА па ГІСТОРЫІ ВКП(б) ДЛЯ ПАРТГУРТКОЎ.
Выд. Партыздата 1937 г.
Цана 20 кап.
ЗАКАЗЫ наложаным плацяжом дасылайце па адрасу: г. Менск, Совецкая, 50, Беларускае «КОГИЗ'а» — «Кніга-поштай».

ЗГУБЛЕНА круглая пячатка на імя калгаса «Чырвоны партызан», Гатаўскага сельсавета, Менскага раёна. Лічыць несапраўднай.

УСІМ СПАЖЫЎЦАМ НАФТАПРАДУКТАЎ
Беларуская кантора «ГЛАВНЕФТЬ»
даводзіць да ведама спажыўцоў нафтапрадуктаў аб неабходнасці прадстаўлення ЗАЯВАК да 25 верасня г. г. на патрэбную колькасць нафтапрадуктаў на 1938 год па наступнай форме:

Назва нафтапрадуктаў з падраздзяленнем па марках	Фактычнае спажыванне ў 1936 г.	Чаканае спажыванне ў 1937 г.	Патрэбнасць на 1938 год	У тым ліку паквартальна			
				I кварт.	II кварт.	III кварт.	IV кварт.

Спажыўцы, якія атрымліваюць нафтапрадукты з нафтабаз, прадстаўляюць заяўку па вышэйпрыведзенай форме ў адпаведныя базы «Главнефть».
Спажыўцы, якія атрымліваюць нафтапрадукты непасрэдна ў свой адрас (транзітам), павінны прадстаўляць заяўкі на гэтыя прадукты Беларускай канторы «ГЛАВНЕФТЬ» па адрасу: г. Менск, вул. Энгельса, 28.
Да заявы неабходна абавязкова прыкласці тлумачальную запіску з падрабязнымі разлікамі, абгрунтаваннем запрактаванай патрэбнасці ў нафтапрадуктах на 1938 г. з указаннем вытворчай праграмы, норм расходу гарючых, нафтапаліва і змазкі, магутнасці сілавых установак, аўтатрактарнага парка, камбайнаў, плошчы, якая падлягае механічнай апрацоўцы па відах работ і т. д.
Арганізацыі, не прадставіўшыя заяўкі, не будуць уключаны ў план снабжэння на 1938 год, а значыцца і не будуць забяспечаны нафтапрадуктамі.

Калектыў работнікаў і студэнты менскага заапетэхікума выражаюць глыбокае спачуванне дырэктару тэхнікума тав. ІОСЕЛЕВУ Р. А. з прычыны пасіглага яго горя — смерці брата ІСААКА АРКАДЗЕВІЧА.

Калектыў работнікаў Інстытута павышэння кваліфікацыі кадраў народнай асветы БССР з жалем паведамляе аб смерці супрацоўніка Інстытута тав. НЕГІНА З. Г. і выражае спачуванне яго сям'і.

НАРКОМУНУТГАНДАЛЬ СССР
САЮЗУНІВЕРМАГ
Менск, Совецкая, 59, тэл. 22-237.
ПАСТУПІЛІ ў ПРОДАЖ:
РАДЫЁ
РАДЫЁПРЫЁМНІКІ «СИ-235» з поўным камплектам лямп, цана 302 руб. 85 кап.
РАДЫЁЛЫ розн. сістэм,
РАДЫЁЛЯМПЫ,
ДЫНАМІКІ, розн. дэталі к радыёпрыёмнікам.
Вялікі выбар ШКОЛЬНА-ПІСЬМОВЫХ ПРЫЛАДАЎ І КАНЦТАВАРАЎ.
Таксама ёсць аўтаматычныя шасцізначныя НУМАРАТАРЫ.
У дзіцячым філіяле ёсць вялікі выбар ЦАЦАК. ДЫРЭКЦЫЯ.
МУЗЫКА
Вялікі выбар музычных інструментаў:
БАЛАЛАЙКІ, МАНДАЛІНЫ, ГІТАРЫ, ГАРМОНІ, БАЯНЫ, ПАТЭФОНЫ ПТЗ.
ГРАМАФОННЫЯ ПЛАСЦІНКІ.

НКА РСФСР
Цэнтральны інстытут
завочнага навучання ІНОЗ замежным мовам
ПРЫЁМ на аддзяленні: ФРАНЦУЗСКАЙ, АНГЛІЙСКАЙ і НЯМЕЦКАЙ МОЎ.
Падрыхтоўка і перападрыхтоўка перакладчыкаў.
Праспект высылаецца за 50 кап. паштовымі маркамі.
Масква, Кузнецкі мост, 3.
У аддзел аб'яў званіце па тэл. 21-845

ДА ВЕДАМА ўсіх прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый г. Менска
У сувязі з тым, што менская АТС прыступіла да складання і выпуску
СПІСА АБАНЕНТАЎ на 1937—38 г.
просьба да ўсіх прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый прыслаць на АТС (вул. Карла Маркса, 10) не пазней 22 верасня г. г. ВЕСТКІ АБ МАЮЧЫХСЯ Ў ІХ ТЭЛЕФОНАХ па наступнай форме:
Назва прадпрыемства, установы і арганізацыі.

№ тэлефона	Найменаванне цэха, аддзела і т. д.	Адрас

Непрадстаўленне весткі ва ўказаны тэрмін пазбавіць АТС магчымасці правільнага ўключэння ў спіс тэлефонаў прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый горада. ДЫРЭКЦЫЯ АТС.

КІРАЎНІЦТВА РС МІЛІЦЫІ НКВД БССР
даводзіць да ведама ўсіх ШОФЕРАЎ і МАТАЦЫКЛІСТАЎ гор. Менска і раёна, што
З 22 ВЕРАСНЯ ПА 5 КАСТРЫЧНІКА 1937 г.
Дзяржінспекцыяй УРСМ НКВД БССР будзе праведзен
абмен шоферскіх дакументаў
на пасведчанне новага ўзору.
Пры абмене дакумента неабходна мець пры сабе:
1. Шоферскае пасведчанне.
2. Пашпарт.
3. Даведку аўтагаспадаркі з указаннем з якога часу працуе шоферам і на якой аўтамашыне (тып і марка аўтамашыны).
4. Дзве фотакарткі без галаўнога ўбора размерам 25х30 мм.
Абмен будзе праведзен па аўтагаспадарках па плану, якія аб дні абмену будуць папярэдне паведамлены.
За даведкамі звяртацца ў Дзяржаўтаінспекцыю (Комуністычная, 1, пакой 57, тэл. 20-024, дадатковы № 87).
КІРАЎНІЦТВА РС МІЛІЦЫІ.

МАГІЛЕЎСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ ІНСТЫТУТ
абвяшчае ПРЫЕМ
на аднагадовыя педкурсы
ВЫКЛАДЧЫКАЎ ГІСТОРЫІ, БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ.
На курсы прымаюцца асобы ад 17 да 35 год, якія маюць закончаную сярэднюю адукацыю.
Усе паступаючыя падвяргаюцца іспытам у аб'ёме сярэдняй школы па рускай і беларускай мовах (пісьмовы твор, граматыка і літаратура), палітграмаце, матэматыцы (вуснай і пісьмовай), фізіцы, хіміі, геаграфіі і адной з замежных моў (англійскай, нямецкай або французскай па выбару).
Заявы падаюцца на імя дырэктара МПІ з прадстаўленнем наступных дакументаў: аўтабіяграфіі, атэстата аб сканчэнні сярэдняй навучальнай установы (у арыгінале), пашпарта (прадстаўляецца пры асабістай яўцы), трох фотакартак (здымкі без галаўных убораў) з уласнаручным подпісам паступаючага на кожнай з іх, засведчаным дзяржустановай, даведкі аб адносінах да вайсковай павіннасці (для ваеннаабавязаных) і марак на 40 кап.
Прыём заяў аб запічэнні праводзіцца да 25 верасня 1937 г.
Прыёмныя іспыты праводзяцца з 25 верасня па 1 кастрычніка.
Пачатак заняткаў 1 кастрычніка 1937 г.
Стыпендыяй курсанты забяспечваюцца да 150 руб. у месяц.
Інтэрнатам курсанты не забяспечваюцца, але будуць выдавацца кватэрныя.
Заявы падаваць па адрасу: г. Магілеў, БССР, Ленінская, 35. канцылярыя МПІ.
ДЫРЭКЦЫЯ.

Уп. Галоўлітбела № К—3051. Друкарня «Звязды», Менск, Совецкая, 63. К.. Б.. Б.